


*Пятро Прыходзька*

*ВОДГУЛЛЕ ГРОМУ*

# Пятро Прыходзька

# ВОДГУЛЛЕ ГРОМУ

Вершы і паэмы

17338-1

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84Бел7
П 85

В новой книге поэзии автор вновь возвращается на фронтовые дороги, вспоминает о том, какой нелегкой ценой досталась нам победа.

Многие стихи пронизаны чувством искренней, сердечной любви к родному краю, его природе. В основу поэмы «Виры Беседи» положены конкретные события из жизни старшего и младшего поколений на заре завоеваний Октября, становления Советской власти.

П $\frac{4702120202-007}{М\ 302(03)-89}$ 63—89

ISBN 5-340-00384-1

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989.

…ЦЕНТРАЛІЗОВАННАЯ СИСТЕМА БИБЛИОТЕК

# Споведзь салдата

*Слова ПЕРАМОГА азарала*
*Нам дарогі і акопны жвір,*
*І яно навекі побач стала*
*З самым дарагім нам словам —*
*МІР.*



* * *

*Павольна наша круціцца Зямля,*
*І руху мы яе не заўважаем.*
*Мы толькі чуем зблізку і здаля,*
*Як навальніцы бухаюць над краем.*

*Жывём усе трывогаю адной:*
*Было Зямлі балюча, як матулі,*
*Калі і ёй, пасечанай вайной,*
*Ляцелі ў грудзі разрыўныя кулі.*

*Яшчэ не ўціхла водгулле грамоў,*
*Што праняслісія смерчам над Зямлёю.*
*Не трэба ёй малітваў і замоў,*
*Адно — не ўзняўся б*
*Зноўку меч над ёю.*

*Зямля не можа свой паскорыць рух,*
*Хоць і ў яе турботаў ёсць нямала.*
*Перададзім жа ёй свой гарт і дух,*
*Каб згінула смяротная навала!*

20 сакавіка 1988 г.



## ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

Зарой берлінскіх дрэваў купы
Амыў вайны чацвёрты год.
Прабіў наскрозь рэйхстага купал
Праменнем яркім сонца ўсход.

Мы падымаліся з акопаў
На золкім майскім скразняку,
І шматпакутная Еўропа
Байцам працягвала руку.

Над ёю чорны крыж смяротны
Рассеклі мы сваім мячом
І на паверку ўсе паротна
Пайшлі пад светлым кумачом.

Для нас не лік багіні Нікі
Сваціў на вёрстах франтавых,
Стаў гэты майскі дзень вялікім
Для ўсіх — і мёртвых, і жывых.

Радзіма ўпісвала імёны
Ў старонкі вогненных былін,
Хоць многія яшчэ з мільёнаў
У невядомасці былі...

Вясна шугала полем гудна
Стуль, дзе акопны дым ачах,
Нас абдымала мнагалюдна
З тугой і радасцю ў вачах.

Зямля адчула разам з намі,
Што надышлі вайне канцы.
Без медалёў і з медалямі
Дамоў вярталіся байцы.

У ціхіх вёсках каля ганкаў
Чуцён быў звонкі косаў клёп.
А хтосьці у полі
Гэтым ранкам
Заворваў плугам мой акоп...

22 сакавіка 1988 г.



## ДВА ЛІСТЫ

*З вершаў,*
*адшуканых у франтавым сшытку*

Адаслаў я ліст увосень
Любай дзеўчыне сваёй,
Бо яна сардэчна просіць,
Каб часцей пісаў я ёй.

Нібы сёння на расстанні
Зззяе месяца святло
І рука яе ў тумане,
Як галубкіна крыло.

Ападае ноч нямая.
Адгрыміць над полем бой,
І я веру — сонца мая
Зноў засвеціць нам з табой.

У паходным маршы ротным
Не апошні я хадок.
І чаргою кулямётнай
Выбіваецца радок.

* * *

Добры дзень, мама! З дальніх краёў
Я пішу табе — сын, твая кроў.
Два гады я табе не пісаў,—
Толькі словы з агню выкрасаў.

А сягоння на роднай зямлі
Горад Лоеў мы ноччу ўзялі.

Ды шкадую, што я не ўвайшоў
Першы ў нашую вёску Альшоў,
Нейкі іншы баец, як мой брат,
Будзе сёння абняць цябе рад.

Ты яго напаі, накармі,
Замест сына свайго абдымі.
Можа, хутка — ты, мама, не плач,—
Я вярнуся, твой юны трубач.

Калі дом спапялёны вайной,
Пабудуем мы новы з табой.
Запытаць хачу, маці, яшчэ —
Як там нашая Бесядзь цячэ?

Ці замёў яе вогненны пыл
І ці многа над ёю магіл?
Хутка, мама, даб'ём немчуру
І к свайму я вярнуся двару.

Не на белай паперы радком —
Дапішу гэты ліст я штыком.

Кастрычнік, 1943 г.
Першы Беларускі фронт



## БАЛАДА СВЯТЛА

У Дрэздэне, у сорак пятым,
Калі сціхаў над Эльбай бой,
Здалося нам:
Хрыстос распяты
Ляжыць пад свастыкай рудой.

Не, не здалося —
Бераг цінны
Ад Эльбы нёс пякельны дым,
І Рафаэлевы карціны
Былі схаваны ў дыме тым...

Мы зналі, што такое раны
І след крывавы ад акоў.
А тут —
У змрок закатаваны
Тварэнні лепшых мастакоў.

Нібыта воіны ў палоне,
Далей ад казак і былін,
Усе яны ў каменяломні,
Ў кардон захутаны былі.

Не ад агню ж і дыму, пэўна,
Хацеў іх фюрэр захаваць,
А каб за бомбу дзесь таемна,
За зброю новую прадаць...

І нас,
Прыйшоўшых з Волгі, з Дона,
Мацней абпёк агонь вайны:
Сама Сіксцінская Мадонна
Была закута ў кайданы...

І Тыцыянава Энеса,
І Рэмбрандта аўтапартрэт...
Каб гэтак —
Сонца на завесы?
Яшчэ не знаў такога свет.
Мы тое сонца з апраметнай
Рукамі ўласнымі ўзялі,
Пры ззянні нашай зоркі светлай
На волю вынеслі з зямлі.
Гара над Эльбаю рудая
Ў прадонне рухнула зусім,
І нам Мадонна маладая
Зноў усміхнулася усім.

Да нас вярнуліся стагоддзі,
Святло жыцця — агонь святы.
Мастацтва
З ісцінаю ў згодзе
Не знікне ў цемры нематы.

26 ліпеня 1986 г.



## ВЯРТАННЕ З ВАЙНЫ

Час на радзіму вызначаў кірункі,
Ў свае пасёлкі, вёскі, гарады.
Здаваць на склад
Салдацкія рыштункі
Была каманда дадзена тады.

Нас клікаў сейбіт-май:
«Хутчэй, салдаты,
Да родных хат
У край свой дарагі!»
Мянялі мы сапёрныя лапаты
На тапары, рыдлёўкі і плугі.

Гвардзейцы з сумам пакідалі часці,
Бо многім сэрцы гора абпякло:
У аднаго — сястры, ў другога — маці,
Ва ўсіх кагосьці дома не было...

Мы пры сустрэчы з роднымі нямала
Спазналі слёз і шчырага цяпла.
Хоць і самім ім хлеба не хапала,
Яны яго дзялілі напалам.

Пыл замятаў разбітыя дарогі,
Руіны хат і голыя палі.
Але пад майскім сонцам перамогі
Мы ўсе адною радасцю жылі.

8 ліпеня 1986 г.



## САЛАЎІ НА ПЛОШЧЫ

У сталіцы нашай сярод ночы,
Толькі ўціх на міг курантаў бой,
Над Масквой-ракой
Ля Краснай плошчы
Салаўі пяюць наперабой.

Мо яны з прылескаў падмаскоўных
Заляцелі ў самы цэнтр Масквы,
Каб вось тут, як верш нешматрадкоўны,
Цішыню адчулі сэрцам вы?

Праляцеўшы рубяжы і межы,
Салаўі абудзяць весні сон.
І для іх з чырваназорнай вежы
Прагучыць начных курантаў звон.

Ні гудкоў машын, ні экскурсантаў,
Што сюды завітваюць здалёк,
Толькі чутна, як ідуць курсанты,—
То гвардзейцаў каравульны крок.

Тут і я, на плошчы неабдымнай,
Пастаю пасля былых баёў.
Край адкажа мне
Дзяржаўным гімнам
І чароўным спевам салаўёў.

1 мая 1987 г.





## ЗЯМЛЯ БАЦЬКІ МІНАЯ

Ты знаеш зямлю, што наноў ажыла,
І памяць людская яе не мінае.
На ёй партызанская зона была,
І звалі яе —
Зона Бацькі Міная.

Тут нават бярозы
займалі свой пост,
Стаялі ў страі, як адважныя воі.
Тут быў калідор
Шырынёй — сорак вёрст —
Вароты для сувязі з роднай Масквою.

Савецкая ўлада свой сцяг над Дзвіной
Трымала й тады, як баі не ўціхалі,
І людзі ў суполцы адной грамадой
Касілі лугі, на палях працавалі.

Ды косы, бывала, адкінуўшы ўбок,
Хапаліся ўсёю сям'ёю за зброю.
Сіроціна, Сураж, Ула, Гарадок
Былі для Міная рэзервамі бою.

Здавацца ў палон,
хто сцяг волі нясе,
Не змог анічым вораг люты прымусіць.
І дзеці — чатыры заложнікі ўсе —
Навек сталі дзецьмі зямлі Беларусі.



І сонца, здаецца, заззяла святлей,
Дзе чайкай на сконе жыццё пракрычала.
Дачушка за бацьку свайго памірала,
А Бацька
Змагаўся за шчасце дзяцей.

Не трэба было ім напышлівых слоў
Да іх буданоў,
Што бяростай бялелі.
З Вялікай зямлі
Сюды йшлі, як дамоў,
Салдаты — паэты Астрэйка, Бялевіч.

Купалы радкі «Партызаны-сыны»
І заклікам людзям былі і загадам,
Зямля гэта — маці сама ў час вайны
Для ўсіх станавілася песняй-баладай.

Пральюцца дажджы па лугах і лясах,
Ды толькі бяда хай старонку мінае.
І воляй і праўдай
Жыць будзе ў вяках
Зямля беларуская
Бацькі Міная.

9 красавіка 1987 г.

17338-1





## ТВАР ВАЙНЫ

Твар вайны 42
Самы жорсткі і дзікі —
Ў рабацінні, ў крывавых рубцах.
Б'е яна
Па малых і вялікіх,
І па маршалах, і па байцах.

Над галовамі хмары навіслі,
Жвір акопны змяшаўся з крывёй.
Сандамір непрыступны на Вісле
Закавалі фашысты бранёй.

Выбух бомбы.
Ляжым пад зямлёю,
Ёю поўныя вушы, раты.
Раны сочацца золкай крывёю —
І не знойдзеш, дзе тыя бінты.

Ні праменьчыка ў той апраметнай,
У якую закінуў агонь.
Свой апошні патрон
Непрыкметна
Заціскаю ў тугую далонь.

Мы не бачым, як сёння на захад
Далей коціцца вал агнявы...
Ні адчаю, ні болю, ні страху —
Толькі думка адна: «Ці жывы?»

Выбух зноў.
Над сабой груды жвіру
Развінаю, як века труны.
Толькі ўстаць бы,
Свайму камандзіру
Далажыць,
Што падняўся з вайны.

16 красавіка 1987 г.



## САЛДАЦКІЯ СНЫ

Байцам не сняцца пантэоны.
*Аляксей Пысін*

Не раз баец перад паходам,
Напэўна, сніў шчаслівы сон.
Ды ні з якое там нагоды
Яму не сніўся пантэон.

З усёй упэўненасцю ў гэтым
І сам паведаць я магу,
Як часам спаў зімой і летам
На снезе і на мурагу.

Дзесь ля дарожнай каляіны
Прылёг на цёплую траву.
Шынель — пад бок,
Шынель на спіну,
На галаву й пад галаву.

У тыл паслаў
Камроты зводку,
Што авалодаў вышынёй.
Заснуў салдат.
І сон салодкі
Яго ахутаў цеплынёй.

Яму прысніўся позні вечар
І дом пад дахам з капяжом.



От запаліла маці ў печы
І скобліць бульбачку нажом.

Ды разбудзіў жа выбух бомбы,
І ён гаворыць дружбаку:
— Які шчаслівы сёння сон быў!
Ну, сапраўды — сон у руку.

— А што? Спаткаўся мо з якою
Няўзнак з красуняю у сне?
— Так, браце. Чуў сваёй шчакою,
Як цалавала
Тут мяне...

8 чэрвеня 1986 г.





## ПЕСНЯ ЗАСТАЕЦЦА ЛЮДЗЯМ

*Памяці Міколы Сурначова*

Быў за спіною край чужы —
Вёрст пяць ці дзесяць да Берліна.
І на апошнім рубяжы
Пад ім раздаўся выбух міны.

Калі агонь яго скасіў
І сілы хлопца пакідалі,
Ён аб адным сяброў прасіў,
Каб толькі маці не казалі...

Жаўрук, крылом абняўшы свет,
Ляцеў высока ў паднябессі...
На полі бою наш паэт
Недапісаў апошняй песні.

Мы шлях прайшлі свой да канца,
Дзе кроў паэта пралілася.
Не стала мужнага байца,
Ды песня людзям засталася.

З агню, з баёў, сівых віроў
Ішлі з той песняю яго мы,
З Берліна да сваіх бароў,
У край бацькоў,
У родны Гомель.

29 студзеня 1986 г.



## ВОБЛІК ДРУГА

Даўно ўжо сціхнуў гром — трубач натхнёны,
Што ўсім жывым і мёртвым збор іграў.

*Аляксей Пысін*

Будзілі дзятлы
Звонкім стукам бор,
А сонца з росаў
Выткала карункі,
Калі ішлі з табой
На першы збор,
Мы — навабранцы —
Са сваім рыштункам.

Я фотакартку
Берагу з тых дзён:
Салдат русявы,
Горам засмучоны,
Глядзіць вачыма,
Сінімі, як лён,
На попел, кроў,
На жвір, ад дыму чорны.

Цяжар вайны
Не скінуць з плеч ніяк,
Заўсёды мы
На тым, на вечным зборы.
Ён — і ў мінулым —
У агні атак,





І ў нашым сёння —
У хадзе без зморы.

Цябе няма са мной,
Ды я з табой,
Не разлучацца, дружа, нам ніколі.
Зноў перачытваю
Я томік твой,
Як баявы лісток
На ратным полі.

Высокі Борак твой —
Твая зямля.
Ты ад яе
Праз вогненныя даты
Раскручваў дрот
Між горкага былля,
Свае мерыдыяны пракладаў ты.

Поўз па-пластунскі
Куршскаю касой,
Пад Рыгай ты свае
Загойваў раны.
І тою франтавою паласой
Зямлі тваёй
Быў твар забінтаваны.

Ты быў стралком, сяржантам
І не раз
Мог капітана замяніць, маёра.

Браў на сябе каманду
Ў трудны час,
Перад агнём і смерцю
Непакора...

Такім стаіш
Перада мной заўжды:
Ў вачах — сінеча,
Думка агнявая.
І не састарылі цябе гады
Ні ў золі золкай,
Ні ў кіпенні мая.

Дык пойдзем, дружа,
Да пляча плячом
Прытулімся шчыльней мы,
Як салдаты.
Паслухай,
Як прыгожа за Дняпром
Пяюць зямлячкі — нашыя
дзяўчаты!

То — Магілёўшчына —
Твая й мая,
Яе зямля найлепшых песень
варта.
Я за цябе
І за сябе ўдвая
Павінен больш прайсці
Хадой упартай.

5 студзеня 1986 г.



## МАЯ ЭСТАФЕТА

Ападаюць хмары снегам,
Серабрацъ вяршыні гор.
Пэўна, й там, за дальняй Вегай,
Ёсць паэзіі прастор.

Ды ці варта мне, паэту,
Узлятаць да зоркі той?
Трэба несці эстафету
Ўдаль дарогаю крутой —

Той, што ў свет вяла ад дому
Без пачатку і канца,
Як у кнізе, ўсім вядомай,—
Лепшай кнізе пра байца.

Свету з радасцю й журбою
Слова праўды раскажы,
Як не раз, хрышчоны боем,
Быў ля смерці на мяжы.

Хоць не меў высокіх званняў,
Меў адно прызванне я:
Быць сумленным у каханні
І адчайным у баях.

З першых дзён сваёй уладзе
Аддаваў душы парыў,

Каб у міры і суладдзі
Мой народ заўсёды жыў.

Мне з гісторыяй у згодзе
Голас трэба свой падаць —
Дваццаць першаму стагоддзю
Эстафету перадаць.

30 кастрычніка 1986 г.



## БАЛАДА ВЕРНАСЦІ

*Памяці пісьменніка, генерала
Мікалая Іванавіча Аляксеева*

Памяць сэрца ў цесны круг сабрала
Тых сяброў, што цэняць дружбы плён.
Паміж нас яшчэ байца не стала,
Што ў страі быў да апошніх дзён.

Мы дадому весняю парою
Зноў ішлі праз цяжкі перавал.
Ну а ён?
Не пакідаў ён строю
Ўсё жыццё, наш добры генерал.

Не цярпеў хлусні ён і падману,
Не любіў загадамі «хлыстаць».
Лепш у бой,
Каб і ў сваіх раманах
З баявым героем побач стаць.

Помню майскі дзень:
У веснім часе,
Калі вішні белыя цвілі,
Афіцэры, што былі ў запасе,
Мы ізноў ішлі
Па той зямлі,

Дзе калісь на брустверах траншэяў
Баявы закончылі свой шлях.

Генерал — наш бацька Аляксееў
Па сваіх нас вёў
Былых франтах.

Дрэздэн. Ваймар.
Лейпцыг нас вітае.
Тыя ж вулкі ў засені прысад.
Толькі ўжо Германія —
Не тая,
Што страчала сорак год назад.

Генерал наш — не скупы на слова —
Больш маўчаў. І як салдат былы
Толькі скажа:
«Тут страчаў Чуйкова.
А вось тут мы з Жукавым былі».

Біла нас не раз бяды навала
І агнямі, і слязьмі з вачэй.
Ды скажу —
З падтрымкай генерала
Нам, байцам, было заўжды лягчэй.

Гартаваўся ў рознай непагодзе
Петраградзец-хлопец малады,
Са старога ў новае стагоддзе
Увайшоў
На многія гады.

А ці думаў, што калісьці будзе
Генералам бараніць свой люд?



Тры вайны яму стралялі ў грудзі,
Тройчы з іхніх вырываўся пут.

Шмат дарог,
Дзе ў хмарах ноч купала,
Ён адолеў у сваёй хадзе.
І казаў:
«Жыву, дзе жыў Купала,
Лепшага жытла няма нідзе».

На зямлі на гэтай гарт байцоўскі
Набываў і ёй казаў: «Люблю».
Дзе камандаваў фронтам Чарняхоўскі,
Вызваляў ён гэтую зямлю.

Восемдзесят пяць
З жыццём у згодзе
Ён аддаў сваёй перадавой.
Шлях яго азораны ў паходзе
Мужнасцю, адвагай баявой.

12 жніўня 1986 г.

## ЗОРНАЕ СЛОВА

Нашы ў бой хадзілі аднагодкі,
І было ім радасна, калі
З іхніх слоў складалі тыя зводкі,
Што ішлі з франтоў па ўсёй зямлі.

Ў кожным слове чулася сумленне,
Боль і радасць,
Бо салдат быў рад
Пасля слоў
«Няўдача», «адступленне»
Словы чуць —
«Масква» і «Сталінград».

Мы іх чулі з вуснаў палкаводцаў,
Маршалаў і радавых байцоў.
Мы ж усе былі
Першапраходцы
Праз агні і тысячы баёў.

Слова П е р а м о г а азарала
Нам дарогі і акопны жвір,
І яно навекі побач стала
З самым дарагім нам словам —
М і р.

25 красавіка 1986 г.



## АПОШНІ БОЙ

*Памяці Міколы Лупсякова*

Над Сеймам — рэчкаю крутою —
Мы правы бераг занялі.
А вораг моцнаю бранёю
Нас адцясняе з той зямлі.

Агонь над брустверам шалее.
Прыстылі пальцы да куркоў.
Наперад выйшаў з батарэяй
Камбат Мікола Лупсякоў.

На танк варожы позірк кінуў:
«Прамой наводкаю — агонь!»
І ў гэты момант выбух мінны
З абедзвюх ног
Зваліў яго.

Кроў з галавы цячэ на вочы
І на зямлю, на пёркі траў.
А ён прыўстаў —
І раз, і двойчы
Яшчэ каманду паўтараў...

Далёка ў роднай вёсцы хата
Дзесь за Дняпром яго была.
Панеслі на руках камбата
Байцы да нейкага жытла...



Вясна ішла пад гул высокі
Зямных і воблачных грамоў.
І жураўлям з краёў далёкіх
Час абвясціў —
Ляцець дамоў.

Дзесь распускалася каліна,
Адсніўшы лютую зіму...
Не ўбачыў наш камбат Берліна,—
Не давялося больш яму

Зноў да гарматнага лафета
Вярнуцца ў свой гвардзейскі строй...
Пайшоў туды,
Дзе ў красках лета
Гудзе ў садку пчаліны рой.

Усё, што сам пісаў ён сэрцам,
Пачуў ад рэк, палёў, бароў,—
Байцам заўжды
Ў баях са смерцю —
Не забываць сваіх сяброў...

6 верасня 1986 г.





## ЛЯ БРАНДЭНБУРГСКІХ ВАРОТ

Не гремит колесница войны.
Что же вы не ушли от погони
Наверху бранденбургской стены,
Боевые немецкие кони?

*Васіль Субоцін*

Не купалі нас у моры славы —
Мы ў агні купаліся, ў залі.
Да Берліна, Прагі, Браціславы
Праз вароты многія прайшлі.

Дзе апошні дым святога бою
Праплываў па жвіры і трысці,
Нам сягоння выпала з табою
Да варот знаёмых зноў прыйсці.

На варотах — усё тыя ж коні,
Што у змрок хаваліся ўначы.
Не ўдалося ў нейкае прадонне
Ім ад нас на захад уцячы...

Знаем Брандэнбургскія вароты
Мы не па кіно. Тут акурат
У атаку кідаліся роты
Пад глухую музыку гармат.

Дзе пралегла падаконным жвірам
Рыса нашай ратнай паласы,



Сёння хтось атручаным эфірам
Супраць нас разносіць галасы.

Ці ж не тут пад купалам высокім
Распісаўся ты штыком, салдат?
Набракаюць дрэвы майскім сокам,
Зацвітае між руінаў сад.

Бачым за варотамі прысады,
Паміж дрэў — высокі, белы гмах.
Пабялёны фарбай каланады,
А над імі — паласаты сцяг.

* * *

Я прыгадаў байцоў адчайных,
Сям'ю салдацкую сваю,
Хоць і турыстам я звычайным
Перад рэйхстагам зноў стаю.

Ў Ціргартане на п'едэстале
Наш воін, з нашага палка.
Неафашысты тут стралялі
Ў байца Івана Шчарбака,

Які стаяў па ўсім законе
На баявым сваім пасту...
Там, за варотамі, ў той зоне,
Таполі гэткія ж растуць.





Ды толькі горкаю маною
Адтуль ляціць у твар імжа,
Дзе паміж мірам і вайною
Была праведзена мяжа —

Апошняя на карце рыса,
Бы стужка тлустай баразны...
Радзімы светлыя абрысы
Ўстаюць з усходняй стараны.

Тут не адзін з нас нёс адвагу.
Ў душы,
каб міру сцяг узняць.
І я прайшоў каля рэйхстагу,
Калі было мне дваццаць пяць.

Тады мы ўсім дамам і хатам
Раскрылі вокны да святла.
Апошнім вогненным раскатам
Вясна салют нам аддала.

У неспакоі сэрца сёння.
Заснуць начамі не магу.
Здалёку ў мройнае бяссонне
Ўрываецца страшэнны гул.

Хтось пагражае новай зброяй,
Яе ў нябёсы хоча ўзняць,
А мы ідзём салдацкім строем,
Планету сэрцам каб абняць.

Каб майскія грамы над намі
Грымелі толькі ў мірных снах
І рассыпаліся дажджамі
Па ўсіх лугах, палях, лясах,

Няхай сваёй дарогай торнай
Да светлай долі кроча люд,
Дзе быў над свастыкаю чорнай
Народаў суд — свяшчэнны суд.

Само жыццё перагартала
Над гэтай плошчай многа дат.
Яшчэ з другога п'едэстала
Мне падае руку салдат —

Той, што, падняўшыся з акопа,
Нікому зла не наракаў,
Хацеў, каб свастыку Еўропа
Больш не ўздзявала на рукаў.

Хто ж за варотамі ахвоча
Там маршыруе ноччу й днём?
Няўжо наўмысна нехта хоча,
Каб зноў рэйхстаг палаў агнём?

Стаю, нібы на ўскраі свету,
Ў чужы ўглядаюся прастор.
А мне зялёная планета
На плечы сыпле іскры зор.

9 мая 1987 г.



## СТРАЛКОЎКА

*Памяці Маршала Савецкага Саюза*
*Георгія Канстанцінавіча Жукава*

Каля сяла, далёкага ад мора,
Была зімой закована рака,
Калі тут нарадзіўся хлопчык Жора,—
Сынок былога рускага стралка.

Хто ведаць мог, што чырванню калінавай
Заззяюць зоркі на яго грудзях,
Што Маршал наш Георгі Канстанцінавіч
Нас павядзе ў далёкі, слаўны шлях?

Ён пачынаўся не на полі голым,—
Праз неабсяжнасць ратных далячынь
Пралёг той шлях ад сопак Халхін-Гола
Аж да сівых Зеелаўскіх вышынь.

Было нас многа, арміяй мільённа
Ішлі.
А ён — адзін для дзесяці франтоў.
І аперацыю «Баграціёна»
Па ўсіх законах маршальскіх правеў.

Былі тры Беларускіх. І чацвёрты.
Дапамагаў нам партызанскі фронт.
У шынялях прабітых і пацёртых
Ля Брандэнбургскіх стрэліся варот.



Ён на парадзе Перамогі зноўку
Прад намі быў на баявым кані.
Але давайце вернемся ў Стралкоўку,—
У тую вёску, ў маладыя дні.

Акруга ўся калужская гамоніць:
Юнак не вешаў шапку на кручок,
А, расцягнуўшы дзедаўскі гармонік,
Дзяўчат збіраў у круг на казачок.

Нярэдка з тым гармонікам бадзёрасць
Пасля баёў прыходзіла ў цішы.
І ён любіў Ясеніна, гаворaць,
За неабдымнасць песеннай душы.

Ніхто яшчэ не змерыў тыя вёрсты,
Якімі мноства ён правёў палкоў.
Стралкоўка! Многа, пэўна, гэта вёска
Паслала ў войска баявых стралкоў?

Само жыццё, нялёгкі лёс вайсковы
Яго ўзнялі над бурнасцю часоў.
І, кажуць, браў ён у паход суровы
Не жэзл, а жменьку жытніх каласоў.

Яго мы голас чулі ў кожнай зводцы,
Якія йшлі з франтоў ва ўсе краі.
Яшчэ якія ў свеце палкаводцы
Вялі за дружбу і за мір баі?

3 снежня 1986 г.





## ПЛАЧ СОЙКІ

Да дрэва дрэва туліцца.
Сцяжынка — нібы вуліца.
Сцяжую ў лес палянаю,
Шукаю след каханае.

Звініць сасна замшэлая,
І плача сойка шэрая:
«Куды, куды?» — пытаецца
І за лістком хаваецца.

Іду дарожкай торнаю
Ў юнацтва непаўторнае.
Лясная даль без краю ўся.
У дзятла запытаюся:

— Скажы мне, дзятлік ветлівы,
Дзе тая сцежка светлая —
Дарожка тая росная
Пад маладымі вёснамі,

Дзе грэліся спатканнямі
У першае каханне мы?
І дзятлік мне адстуквае:
«Не тут, не тут, не тут твае...»

Пытаюся ў сарокі я:
— А дзе сасна высокая,
Ляшчына тая хілая,
Дзе рваў арэхі з мілаю?

Маўчаць сасонкі гонкія,
Сарокі белабокія.
І дзяцел больш не стукае.
А сойка дуб баюкае:

«Ст-рык! Ст-рык!» — крычыць.
І з гор лясных
Адказ нясецца горасны:
«Твая Надзея згублена,
Больш не спаткаеш любае!»

Плач сойкі над калінамі
Трывожыць успамінамі
І памяцню гарачаю
Аб пачуцці нястрачаным.

30 мая 1986 г.



## ПРЫСВЯЧЭННЕ

*В. Я.*

Табе я песню прысвячаю,
Якую доўга ў сэрцы нёс.
Вянок сплятаю з іван-чаю
І срэбра вечаровых рос.

Па небасхіле разальецца
Вясёлка ціхаю журбой.
Надзея ў сэрцы застаецца,
Што не расстанемся з табой.

Твая дарога ў свет дзівосны
З дзявочых дзён не зарасла
І ў Беларусь з кубанскіх вёснаў
Цябе на Свіслач прывяла.

О маладосць! Яна над намі
Пранесла тысячы грамоў.
І вось блакітнымі вачамі
Ты усміхнулася мне зноў.

Іду я ў строй свой пасівелы
На кліч салдацкае трубы.
Адно каб воран раз'ярэлы
Нам не накаркаў зноў журбы.

І без таго сціхаюць крокі
У запасным маім палку.

А ты — ці блізка, ці далёка —
Падай таварышу руку.

Хай назаўсёды знікне морак
Разладаў, спрэчак і зняваг.
Ідуць жа ветразі па моры
І ў буру свой трымаюць сцяг.

10 чэрвеня 1986 г.



## ШЧЫРАСЦЬ ЛЮБОВІ

Не сцвярджай самотным успамінам,
Што каханне першае прайшло.
Я ішоў па многіх з ім краінах,
Калі побач любай не было.

Нас вадзілі сцежкі франтавыя
Па зямлі,
Апаленай вайной.
Але ўсе мы — хлопцы маладыя —
Ўсе любоўю мы жылі адной.

Узаемна чыстым сэрцам шчырым
Мы кахалі прыгажунь-дзяўчат.
І з вайны
З вясновым сонцам, з мірам
Мы прыйшлі, прыйшлі да іхніх хат.

Крочыш ціха сцежкаю, бывала,
Праз лясок з каханаю сваёй
І глядзіш,
Каб на яе не ўпала
Хоць дажджынка нейкаю тугой...

Як сабе,
Свайму каханню верыў,
І, калі дзесь пад агонь трапляў,
Ты дзяўчыну не пускаў наперад,
Сам яе ўсім сэрцам засланяў.

Ганарыся тым, што жыў сумленна,
Сэрца ўсё каханню аддаваў,
Каб яно было у нас нятленным
І цябе твой край не забываў.

28 чэрвеня 1986 г.



## АГЕНЬЧЫК У АКНЕ

Салдат прынёс дамоў
І радасць і любоў.
*З песні*

Калі ішлі дамоў салдаты,
Шчаслівы выпаў лёс і мне:
У змроку адзінокай хаты
Гарэў агеньчык у акне.

І толькі я ступіў на ганак —
Цяплом абветрыла ўсяго.
Мяне прымае цётка Ганна,
Як сына роднага свайго.

Сваіх дзяцей яна не мела,
Пра іх мо толькі сніла сны.
І гэтак рана аўдавела,
Бо не вярнуўся муж з вайны.

Магчыма, дзесьці лёг пад Брэстам
І замяла вайна сляды:
Мільёны згінулі без вестак
У тыя цяжкія гады.

Ніхто з яго сямейкі брацкай
Не змог прынесці весткі ёй...
Адзін трохкутнічак салдацкі
І той... без пошты палявой.



Ды ў невядомай нейкай веры
Яна жыла зусім адна.
Згатуе бульбы на вячэру
І ўсё сядзіць каля акна.

Раз перачытвае мо соты
Лісток, што хтосьці ёй прынёс.
І я з сваёй стралковай роты
Ёй напісаў пра ўласны лёс.

Павеяў час шчаслівым ветрам
Нам з ёй у роднай старане.
І вось яе агеньчык светлы
Тут засвяціўся для мяне.

Ідзе ў нас цёплая гамонка.
З работы крочу я дамоў,
Дзе ў шыбы стукае сасонка,
Нібы чакаючы размоў.

На ёй зіхцяць пад Шляхам Млечным
Галінкі ў ранняй сівізне.
А ў цёткі Ганны кожны вечар
Гарыць агеньчык у акне.

10 лютага 1988 г.





# Карэнне травы

*На свеце жыцьмем — мала, а ці многа —*
*Не падаць нам у бездань забыцця,*
*Бо нас вядзе адзіная дарога*
*Ў бясконцасць чалавечага быцця.*



## ГАЛІНКА БЭЗУ

Напэўна, самае вялікае па-
каранне для дрэва — гэта
стаць пагранічным слупом.
*Яўген Еўтушэнка*

Мая хацінка пад высокім клёнам
Стаіць у ціхай засені лясной.
Персідскі бэз,
у вішаньку ўлюбёны,
Буяе цветам кожнаю вясной.

Пучок вясны з галінкі я зрываю,
Бо знаю —
будзе развінацца зноў,
Як нітачка жыцця майго жывая,
Што працягнулася праз шмат гадоў.

Я кожны раз гляджу на кусцік бэзу,
Як у начным паўзмроку на агонь.
Хачу,
каб мой зямны жыцця адрэзак
Падобны быў да аганька яго.

На свеце жыцьмем —
мала, а ці многа —
Не падаць нам у бездань забыцця,
Бо нас вядзе адзіная дарога
Ў бясконцасць чалавечага быцця.



Твой шлях пралёг —
ці доўгі ці кароткі —
Праз мноства розных
незабыўных дат.
І помніш дзень,
Калі на змену продкам
Ты стаў у строй
як іхні сын-салдат.

Ты тры гады быў у стралковай роце
І мо не раз ляжаў у шпіталях,
Але,
як нітка пражы ў калаўроце,
Ўвесь шар зямны
Апаясаў твой шлях.

Слупы граніц мільгалі справа,
злева,
Высокі лес валіўся пад агнём.
Але твайго жыцця
святое дрэва
Не стала пагранічным дзесь слупом.

Твая радзіма —
для цябе аснова,
Яна тваёю стала вышынёй,
З якой у неўміручасць
прыжыццёва
Ты крочыў ціхай сцежкаю сваёй.

Ты зразумееў адно —
нічога ў свеце
Няма радней,
чым твой бацькоўскі дом.
Дык хай табе
Ў вясновым цвеце свеціць
Галінка бэзу
залатым святлом!

3 ліпеня 1986 г.



## ВАСІЛЬКОВАЕ ПОЛЕ

...Я ўсяго — васілёк,
Лёс, відаць, незнарок
Мяне кінуў на сумнае поле.
*Міхась Васілёк*

Поле, поле! Ў ліхалецці
Ты спазнала шмат пакут.
Васільку на белым свеце
Падарыла родны кут.

Мо таму, што будавалі
Хаткі там свае бабры,
І Баброўняю назвалі
Людзі вёсачку ў бары?

Ля хаціны сіратлівай
Клён хіліўся да ракі,
Над палоскай неўрадлівай
Пралі ніткі жаўрукі.

Весяліліся паненкі,
Што спявалі найчасцей.
Толькі плач дзяцей ды енкі
Ўдоў-матуль былі гучней.

Перакатам звонкім гоман
Несла рэха праз лясок.
А на полі, там дзе Нёман,
Спеў блакітны васілёк.



Падаваў сцяблінкам голас,
Заглядзеўшыся ў раку,
Каб яму жытнёвы колас
Працягнуў сваю руку.

Расцвітаў у полі летам
Сінявокай зоркай ён
І нярэдка іншым кветам
Абуджаў самотны сон.

Можа, хтось лічыў, нібыта
Пустацвет той васілёк.
Ён жа выйшаў з тога жыта,
Што ў жыццё свой скорыць крок.

Стаў ён з песняю на ўзроўні,
Дрэўкам стаў яе тугім...
І пайшоў, пайшоў з Баброўні
Па ўсім краі дарагім.

Сёння крочым разам з ім мы
Зноў да роднага кутка.
Гэта — вольная Радзіма,
Гэта — поле Васілька!

12 верасня 1985 г.





## ТВОЙ ЧЭРВЕНЬ

*Дачцэ Людміле*

Твой месяц — чэрвень.
Над абшарам
Пачаткам лета звоніць бор.
А ты ідзеш услед за марай,
І на далоні — россып зор.

Ты нарадзілася пад зоркай,
Што шчыра глянула з нябёс,
Калі зямля ў залеве горкай
Яшчэ не высахла ад слёз.

Ідзеш у новым пакаленні
Пасляваенных тых гадоў,
Што крочуць сёння ў паскарэнні
І апярэджваюць бацькоў.

Час дапаможа марам збыцца
Ў бясконцай вернасці жыццю.
Адно каб толькі ў дабрабыце
Не аддавацца забыццю.

Не проста быць былінкай крохкай,—
Сваю ўпрыгожваць маладосць,
А не шукаць дарогі лёгкай,
Калі ў цябе сумненні ёсць...

У трыццаць пяць і ў сорак восем
Вышэй тугія крылы ўзвей!
Яшчэ твая не скора восень,
Не адспяваў твой салавей.

Шмат будзе вёснаў, зор вячэрніх,
Жыцця без слёз і без маны.
Не паўтарыўся б толькі чэрвень
З жахлівым першым днём вайны...

25 чэрвеня 1986 г.



## З Чарнобыльскай зоны

### ПРЫПЯЦКІЯ НЕЗАБУДКІ

Успыхнуў атам.
І салдаты
Ўступілі першымі ў пажар,
Каб менш прыйшло і ў нашы хаты
І ў сэрцы атамных ахвяр.

Як гром, панеслася стыхія
Раскатамі ва усе куткі.
А незабудкі трапяткія
Цвілі ля Прыпяці-ракі.

Іх серабрыстыя галоўкі
Былі ахутаны журбой.
З-пад іх быліначчкі ў дамоўкі
Шпакі прыносілі з сабой.

Дзе хвалі прыпяцкія льюцца
Ў палітых горам берагах,
Яны паглядваюць на шлях,
Пытаючы: «Куды ж вы, людцы?

Няўжо ж засыпаныя брудам
Загінем мы на доўгі час?
Не забывайце незабудак,—
І кветкі не забудуць вас!»

25 мая 1986 г.

## БРАГІНСКІ КЛЁН

Когда прекрасные деревья,
Не зная, что они враги,
На ветвях держат не поверья,
А тайны ядерной пурги.
*Уладзімір Сакалоў*

Пад Брагінам,
над ціхім плёсам,
Адбіўшы ў ростані паклон,
Людзьмі пакінутую вёску
Аберагаць застаўся ён.

Было сваё жыццё і ў клёна:
Дзе мы вялі калісь баі,
Тут і яму пад пышнай кронай
Спявалі дружна салаўі.

Равеснік ён ваенным дзецям,
Тут нарадзіўся,
тут і ўзрос,
Аддаючы начам,
дасвеццям
Жывое срэбра чыстых рос...

Цяпер стаіць,
бы адзічэлы,
З пахілым позіркам сваім.
І толькі вусень жоўта-белы
Лянiва поўзае па ім.



Ніхто з яго перад дарогай
Лістка ў далёкі шлях не браў.
А ён жа сам перасцярогай
Стаў для людзей, і дрэў, і траў.

22 чэрвеня 1987 г.

## СЛЯДЫ ТРЫВОГІ

Май незнарок у нашу мрою
Ўварваўся подыхам журбы.
І гэтай весняю парою
Мы не праводзілі сяўбы.

У лесе, ў полі ля дарогі —
Усюды горкія сляды.
На сэрцы ўспыхваюць трывогі
Ад зольнай атамнай бяды.

Там, дзе крынічка выбівала
З зямлі струменьчыкі свае,
Сягоння ля свайго прычала
Вады не чэрпаем з яе...

Кудысь павезлі на машынах
Тых, што пакінулі свой дом,
Нібыта бежанцаў, Айчына
Прыкрыла іх сваім крылом.

Яны расталіся з лясамі,
З садамі, ўдалеч ідучы,—
На колькі год — не знаюць самі —
Але захоўваюць ключы
Ад тых варот, дзе ветрык вее,
Прылёгшы ў доле між платоў...
Яшчэ жыве ў душы надзея,
Што, можа, вернемся дамоў.

5 мая 1987 г.



## КАРЭННЕ ТРАВЫ

Ці ёсць у свеце
Хоць адна мясцінка,
Бязмоўная часцінка на зямлі,
Дзе б не было
Ні птушкі, ні былінкі,
Дзе б кроны ў неба
Дрэвы не ўзнялі?
Расце трава паўсюдна —
На балотах
І на вяршынях гор —
Ці снег, ці гром,
А хтосьці ж недзе
Топча травы ботам
І хоча стаць
Над імі ўладаром.
Нібыта ён
На ўсе куткі зямныя,
На ўсю планету атрымаў правы.
Што да таго яму,
Як ільняныя
Цвітуць палі,
Шуміць лісцё травы...
Забыў той «бог»
Альбо зусім не ведаў
Пра слёзы тысяч мацярок і ўдоў,
І колькі мы
Ў жыцці спазналі бедаў,
Калі жылі ў нястачы

Шмат гадоў...
А ён распух ад прагі, духу злога
Ў імкненні да сусветных заваёў.
А ці падумаў,
Што зямля нічога
Не дасць без дрэў,
Без траў, без каранёў?
Глядзі —
Асфальт травінка прабівае
І прарастае мох на валунах!
А як прыемна сэрцу вестка тая,
Калі сады
Ўзрастаюць на пясках!
Нам сеяць, жаць
Дзеля сябе і ўнукаў,
Ахоўваць чысты водар баравы,
Бо агрубелі б, пэўна, нашы рукі
Без дотыку
Да каранёў травы.
Хоць на ялінцы абсякаюць голле,—
Яна ж расце, ўсё высіцца між пнёў...
І мы —
Як травы, дрэвы,
Кветкі ў полі,—
Усе ўзрастаем з вечных каранёў.

1 кастрычніка 1986 г.



## ВІСЛЕНСКАЯ БЫЛІНКА

*Памяці Анны Герман*

Вісла ў бераг білася былінкай,
Абмывала прыдарожны жвір.
Падарыла полька мне хусцінку
Там, калі ўзялі мы Сандамір.

А чаму? Мой шлях не тут пачаты,
Гэты горад браў я не адзін,
Проста дораць польскія дзяўчаты,
Як і ў нас, хусцінкі на ўспамін.

Не чакаў дарунку я, прызнацца,
У баі паранены салдат:
«Санітары, пачакайце, братцы,
Не нясіце хутка ў медсанбат!»

Дзе ж яна? Прайшла, як незабудка,
І раптоўна знікла —
не дагнаць...
На яе ж хусцінцы на бялюткай
Дзве калінкі чырванню гараць.

Паднялі мяне сябры са ўзвода,
Каб вярнуцца мне у строй хутчэй.
Дзе ж дзяўчына?
Зоркай прад усходам,
Бы пагас агонь яе вачэй.

Хто яна — ці Ядзя, ці Яніна?
Не назвала нат свайго імя.
На пытанні гэтыя быліна
Не магла мне адказаць сама.

Колькі раз пасля праз Польшчу ехаў,
Ды яна насустрач не прыйшла,
Толькі Вісла з Сандаміра рэхам
Маладосці голас падала.

Цвет вішнёвы асыпаўся долу,
І плыла мелодыя за мной.
Не, не ад царквы, не ад касцёлу
Голас быў у споведзі зямной.

Песня стуль да сэрца далятае,
З тых краёў, дзе йшоў я па вайне,
То спявала мо дзяўчына тая,
Што хусцінку падарыла мне.

25 мая 1987 г.



## НА ВОЗЕРЫ РЫЦА

Першы раз цябе, возера Рыца,
Я сустрэў між абхазскіх вышынь.
Як змагло ты з аблокамі зліцца,
У такую сягнуць далячынь?

Вышынёю, што ўперлася ў неба,
Звоняць хвалі ракі Юпшары.
Хмаркі нанач кладуцца на грэбень
Ясназорнай мяцежнай гары.

Для цябе мо на гэту вяршыню
Размывалі дарогу снягі?
З гор зрываюцца гулкаю плынню
Вадаспады ў твае берагі.

Я стаю, я гляджу ў захапленні,
Як бруіш ты пад горнай градой,
Дзе самшыты і травы з каменнем
Амываюцца чыстай вадой.

Не забуду я возера Рыцу,
Буду помніць усё да драбніц.
Пэўна ж так наша Нарач бруіцца,
Несучы бляск чысцюткіх крыніц.

Як далёка ад роднай прыроды
Я над Рыцай сягоння іду,
І баюся, як воін з паходу,
Пыл атрэсці на гэту ваду.

24 ліпеня 1986 г.

## СЛЯЗА СУМЛЕННЯ

### Паэма

Кто прячет прошлое ревниво,
Тот вряд ли с будущим в ладу.
*Аляксандр Твардоўскі*

Зусім не з тых я, хто слязамі
Свае сцяжыны амываў.
Я больш уласнымі рукамі
Чужыя слёзы выціраў.
«Так,— чую,—
Хочаш ты разважыць,
Як родны край быў у слязах.
А што вышэй пра гэта скажуць,
Як аднясуцца і ў нізах?»

Гадаць не будзем, а ці ў модзе
Радкі напісаных лісткоў
І што мой крытык у іх знойдзе,
Ў саміх радках і між радкоў...

Бывала — заадно ўзвышалі
Мы і «мудрэйшага» між нас.
З ягоным імем будавалі
Краіну мы ў нялёгкі час.
Мы за яго ішлі ў паходы
І з чыстым сэрцам праваты
Яму складалі песні, оды
І ў вершах доўгія лісты.



Казалі: мы — яго салдаты,
І кожны з нас — ягоны сын.
І я пісаў так зухавата,
А хіба толькі я адзін?

Пеў «алілуя» днём і ўночы
Зямляк-грузін і беларус.
А ён прыжмурваў толькі вочы
І усміхаўся ціха ў вус.

Хто ж крыўду нёс з агнём і дымам
Героям — маршалам, байцам,
Якіх у злыя леты, зімы
Клялі, як ворагаў Радзімы,
Не слёзы — кроў лілася там...

Хто мог адразу ў холад камер
Бязвінных тысячы кідаць?
Не сэрца бацькава, а камень
Было ў грудзях яго, відаць...

А мы ж, калі яго хавалі,
Так горка плакалі над ім.
Ці зналі мы, з якое сталі
Меч гартаваўся нам усім?

Былі з апошняю скарынкай
На небагатых мы харчах,—
Баяліся ж, каб хоць слязінку
Ён не заўважыў на вачах.

Хто кажа, быццам ён не ведаў,
Што робяць за яго спіной?
Адкуль жа йшлі ўсе нашы беды,
Чыёй яны былі віной?

Хлусілі мы, што ў нас багацце,
Што мы заможна ўсе жывём.
Ён нам і хлеб, і сонца ў хаце —
Ўсё засланяў сваім «святлом».

Лічылі ўсе, што бацька Сталін
Сам з намі сеяў, сам і жаў...
А ён, паглядваючы ў далі,
На нас нікольк не зважаў.

Усё сам-насам вырашаў ён
І вызначаў сабе свой час.
Сябе да неба узвышаў ён,
Лічыў «шурубчыкамі» нас.

Ды ў шуме рэк, палёў, заводаў —
Зямлі,
        што несла нам дары,
З «правадыром усіх народаў»
Былі яшчэ «правадыры»...

Яны, бы ў іншым вымярэнні,
Вайстрылі ўладнае асцё,
Але ж усе яго імкненні
Сабой праводзілі ў жыццё.



Былі мы ўпэўнены, што можна
Зрабіць мацнейшаю браню...
А на душы было трывожна —
Нам рыхтаваў фашызм вайну.

Калі пайшлі на нас чужынцы,
Мы ўсе ўзяліся за штыкі:
І тыя,
        што былі у ссылцы,
І нат «былыя кулакі».

Замест тых воінаў ахвяры,
Якіх панішчыла турма,
Давала новых камандармаў
Нам падмаскоўная зіма.

У час вайны за перамогу
Ён разам з намі быў і сам.
Якую ж цяжкую дарогу
Адольваць давялося нам!

І разбурэнні, й галадуху —
Народ усё ў жыцці стрываў,
І, як сапраўдны бацька, духу
Сынам у бойках прыдаваў.

А ён лічыў сам, як і марыў,
Што над усім стратэгам быў:
Ўсе дзесяць «сталінскіх» удараў
Адзін нібыта ён зрабіў...

Не даваяраючы нікому,
Усё прыпісваў сам сабе.
Ды раздалося рэха грому
У грознай з культам барацьбе.

Дваццаты з'езд, як сонца ззянне,
Прайшоў абсяг усіх краёў.
І мы страчалі ў час вяртання
Слязамі радасці сяброў.

О, каб ён мог у шматгалоссі
Пачуць хоць рэха тых дарог,
З якіх у весні час ці ўвосень
Не кожны ўжо вярнуцца змог...

Пачулі гарады і вёскі,
Што ў строй з нябыту ўсталі зноў
І Чарвякоў наш, і Пятроўскі,
І Тупалеў, і Каралёў.

Мы, асудзіўшы дзеі культу,
Усім наказвалі тады,
Каб той,
Хто стане зноў ля пульту,
Не замятаў хлуснёй сляды.

Мы з праўдай Леніна святою
Свой набіралі ўвысь узлёт.
Чаму ж маўчалі ў час застою,
Нібы вады набраўшы ў рот?



Мы не маглі сказаць нічога
Таму гаспадару свайму,
Што абяцаў з трыбуны многа,—
У ладкі пляскалі яму.

Не дбаў пра сена, пра салому,
Пра хлеб надзённы, пра метал
І пры жыцці сабе самому
Ужо узводзіў п'едэстал.

І крыўдна нам было да болю —
Байцам, што ўсю вайну прайшлі,
Бы вырашаў на ратным полі
Ўсё лёс адной «Малой Зямлі».

Хвалу спявалі чалавеку,
Што быў такі ж, як мы ў баях,—
А у яго за чвэртку веку
Ажно пяць зорак на грудзях!..

Лічыўся першым з громкім імем
Героем працы і баёў,
Дзяліўся шчодра
Толькі з тымі,
Хто ўсё прысвойваў як сваё.

І ён, бы выліты са сталі,
Памахваў нам рукой з Крамля,
І з кніг, што іншыя пісалі,
Яго свяцілася імя...

Не адчувалі ў сэрцы стомы
Ў часіны горкія тады,
І зноў на з'ездзе
Дваццаць сёмым
Шлях вызначалі на гады.

Сіл дарма страчана нямала,
Але упэўненасць расла,
Што парасткі з імжы апалай
Праб'юцца зноўку да святла.

У кожнай справе ёсць натхненне.
І хто ўзначаліў авангард,
Павінен знаць,
Што ў паскарэнні
Ні кроку больш няма назад.

Святло душы нам несці ў слове
Усім — і нам, чытач, з табой,
Каб мы ў сваёй перабудове
Заўжды вялі за праўду бой.

Ёсць праўда-матка.
З праўдай тою
Сам не хлусі сабе нідзе,
Каб не было ў нас больш застою
Ў жыцці,
У працы
І ў хадзе!

Кастрычнік — снежань 1987 г.



## СУСТРЭЧА З ВАВЁРКАЙ

Звычайныя на свеце з'явы
Ўжо не здзіўляюць часам нас.
Паміж сабой і сны, і явы
Пераплятаюцца ў наш час.

Сяджу над Свіслаччу, з пагорка
Ўніз паглядаю на ставок.
У цэнтры горада вавёрка
Па ціхіх ліпках
Скок ды скок.

Ёй на галінках гнуткіх лоўка
Аблізваць росныя лісты.
Чаму ж ты, рыжая сяброўка,
Барок пакінула густы?

Там больш утульна і прывольна —
Арэшкі, шышкі і грыбкі.
А тут — сама глядзі — няўмольна
Газуюць вунь грузавікі.

Грукочуць гулкія трамваі,
Ў паветры — газавы смурод.
Тут і ласі, як каля гаю,
Не пераходзяць рэчку ўброд.

Чаго ж сюды ты завітала?
Мо прыскакала па яду?

Напэўна, стала шышак мала
Там, дзе спаткала ты бяду?..

Звалілі той барок, дзе зроду
Ніхто былінкі не кранаў,
Ці, можа, там усю прыроду
Якісь бадзяга даканаў?

А ты ля нашага квартала
Знайшла прытулак і любоў
І нездарма, напэўна, стала
Сяброўкай шызых галубоў.

27 ліпеня 1986 г.



* * *

Я жыў пад крыламі завей,
Спазнаў замнога хвалявання.
Чаму ж, чароўная, раней
Не мог прызнацца я ў каханні?

Раскрыў бы я табе ўвесь свет,
Але, праводзячы дахаты,
Прасіў, як наш адзін паэт:
«Ты не цалуй мяне, салдата!»

Твой пацалунак абпячэ,
Гарачым болем адзавецца.
Ну, а маё ж баліць яшчэ
Ад незабыўнай стрэчы сэрца.

Ці ж вінен, любая, я ў тым,
Што ты спазнала ласкі мала?
Мяне ў маім шляху крутым
Так шмат маланка абпякала.

12 лістапада 1986 г.

## ДЗЯВОЧАЯ ПЕСНЯ

Не прызнаўся мне любы мой,
Што мяне пакахаў.
Адыходзіў на службу ён
І рукой памахаў.

За старонкай палескаю
Служыць ён у палку.
Напішу яму вестку я
На кляновым лістку.

На лісток гэты жылкамі
Леглі сцежкі-гады.
Хай да сэрцайка мілы мой
Адшукае сляды.

Нельга слову сардэчнаму
Быльнягом зарасці.
Буду сцежкай спрадвечнаю
За табою ісці.

Свае радасці, беды я
Не ўтаю аніяк.
Пра любоў маю ведае
Клён, ды поле, ды я.

5 студзеня 1987 г.



## АДЗІНОТА НА ВЫШЫНІ

Па абавязку і па чыну
Падняўся ты на вышыню:
Снягі завейваюць лагчыну
І засланяюць вочы дню.

Для ветру ёсць і тут работа —
Абчэсваць скалы, камяні.
Цябе ж чамусьці адзінота
Гняце ў вышэзнай цішыні.

Пасада добрая, улада
І слава — ўсё ў цябе было.
Чаму ж узнёсласці не рада
Тваё задумнае чало?

Ці чуеш ты, як пад табою
Высокі ствол сасны звініць?
Няўжо злякнуўся ў ходзе бою,
Згубіў сваю зямную ніць?

Ты ж так на вышыню ірваўся,
Застацца каб навек на ёй,
Адсюль пабачыць, як зямля ўся
Арбітай круціцца сваёй.

Ну, што ж, глядзі!
Ва ўласнай кнізе
Адлюстраваны твой узлёт.

А ці ты бачыш, як унізе
Працуе дзень і ноч народ?

Свае адсюль ты аглядаеш
Дарожкі, сцежачкі ў трысці,
Але ўжо тых не заўважаеш,
Хто дапамог табе ўзысці.

Сваёй не бачыш мужнай рацi
І нат таго, дружыў ты з кім,
Бо назаўжды свой гонар страціў,
Забіў яго ў сабе самім...

18 снежня 1987 г.



## СВЯТЛО НЕЗАБУДКІ

*Унучцы Наташы —*
*калі ёй споўнілася*
*шаснаццаць гадоў.*

З жыццём на першыя спатканні
Ідзеш у юнай ты красе.
Блакіт вачэй гарыць світаннем,
Як незабудачка ў расе.

Твой снежань кволыя былінкі
Прыкрыў сумётамі ў палях,
Нібы нябёсныя пылінкі
Сняжынкі падаюць на шлях.

А памятаеш, нібы знічку,
Знайшлі гняздзечка ля ракі?
Паіла пліску ты з крынічкі
І выпускала ўвысь з рукі.

І ты сама імклівай птушкай,
Як крылца, ўскідвала руку,
Калі цябе, малую, гушкаў
Я на арэлях у садку.

Пасля ішлі з ляшчыны гнуткай
Арэхі ў кошыкі ірваць,
А па сцяжынцы незабудкай
Ішло к нам лета даспяваць.



Дык не забудзь, дзе б ні былі мы
І колькі б ні прайшло гадоў,
Што ёсць на свеце кут радзімы
Тваіх бацькоў, тваіх дзядоў.

Дамоў вяртайся з розных сцежак,
Куды б цябе ні кінуў лёс!
Нам ад вачэй тваіх усмешак
Яшчэ святлейшай сінь нябёс.

Не забывай тае сцяжынкі,
Дзе дух юнацтва не ачах.
Твае там першыя слязінкі
На незабудчыных вачах...

14 снежня 1987 г.



# Золак
# над Бесяддзю

*Жыццё ідзе. І ў мужным кроку*
*Я маладосць пачуў сваю,*
*Нібыта ў школе на уроку*
*Адказ настаўнікам даю.*



## ЗЯМЛЯ РАДЗІМІЧАЎ

*Паводле аднаго падання*

Мяне мой Хоцімск, пэўна, папракае.
Што гэтак мала пра яго пісаў.
Адкуль жа назва у яго такая?
Прызнацца,
Доўга я не знаў і сам.

О родны кут!
Хто надаваў акрасу
Для назваў тых, якіх у краі шмат?
Бялынічы, Гарынічы, Бекасы —
У кожнай безліч векапомных дат.

Спытай, чаму назваў, з якой нагоды
Далёкі век радзімічамі нас?
На ўсе пытанні, як жылі народы,
Радзіма-маці нам дае адказ.

Люблю цябе, мой гарадок. Не госцем
Твой чую ўсюды пульс, дзе ні ступлю.
Тут, ідучы па сцежках маладосці,
Я чую сэрцам родную зямлю.

Я па яе
Сцяжынках і дарогах
Правёў з сабою
Маладосць маю.
Цябе, мой край,



У шчасці і ў трывогах
Па кожным дрэве,
Доме пазнаю.

Я чуў — табе з трынаццатага веку
Прывёз паненку княжыч малады.
І вось паданне, што прыйшло аднекуль,
Вядзе мяне ў далёкія гады...

Пад сонцам сохлі
Гарлачы на плоце,
Свой грай вялі
Ў каноплях вераб'і.
І пры любой пагодзе —
Ў спёцы, ў слоце —
Бруіла Бесядзь
Праз лугі, гаі.

Заўжды на ёй —
На золку і змярканні —
Быў чуцен плёскат рыб
І рып вясла.
А па рацэ
Пад крыллем быстрай кані
Плылі чаўны,—
Куды іх даль вяла.

У пене хваль
Вады раскалыханай
Купалі пёркі ластаўкі, стрыжы.



І многа хлопцаў
Да адной каханай
Плылі шмат вёрст
Па Бесядзі, Сажы.

Радзімічы з-пад Крычава,
Прапойска,
Свяцілавіч
І іншых гарадкоў
Ішлі ў другое княства,
Ды не з войскам —
З дружынаю
Адданых дружбакоў.

Адна іх мара
Ўсіх адзінакроўна
З сваіх куткоў
Да Гомеля вяла:
Там Хацім'я —
Чароўная князёўна,
Пры ўсёй красе
Нявестаю была.

Прад ёю зоркі
Нат цямнелі ўночы,
Яна святлей за іх
Была сама:
Хоць толькі раз
Ёй паглядзіш у вочы —
У лета ператворыцца зіма...





Узносячы вышэй
Пушчанскі гоман
І гонар свой,
Што надалі бацькі,
Ўсе княжыцы
Плылі ў далёкі Гомель,
Да князя Радзькі,
Да яго дачкі.

Князёўне кожны
Вёз дароў нямала,
Мог на кані
Прад ёй пагарцаваць.
Ды ўсім яна
Ў каханні адмаўляла,
Таму, хто пакахаў,
Не дазваляла —
Хоць звычай быў —
Рукі пацалаваць.

І слухаць не хацела
Пра каханне,
Хоць ёй было ужо
Семнаццаць год.
А заспявае песню
На расстанне —
Увесь наўкол
Заслухваўся народ:
«Колькі ў гэтай хаце
Ў столі ёсць сучкоў —



Столькі у Хацім'і
Слаўных жанішкоў.
Толькі пацямнелі
Ўсе сучкі.
Едзьце ж вы дадому,
Жанішкі!»

Ва ўсёй акрузе
Не было ёй роўных,
Яе красы
Не апісаць ніяк.
І хоць была
Багатаю князёўнай,
Насіла просты
Сельскі андарак.

З дзяўчатамі
На полі працавала
І нават жаць магла
Сярпом, касой.
За гэта толькі маці
Папракала:
«Каго ж я
Ўзнагародзіла красой?»

Казалі ж людзі:
«Казка — не дзяўчына.
Няма нідзе
Ёй роўных жаніхоў...»
Яна ад хлопцаў





Адступала чынна,
Не падступіцца —
Хоць ты пан з паноў.

На шлюб з ніводным
Не магла згадзіцца.
І княжычы,
Вярнуўшыся дамоў,
Там будавалі
Ў гонар чараўніцы
Палацаў шмат
І нават гарадоў.

А Хацім'я
Успыхвала заранкай,
Нібыта сонца
Палымнела ў ёй.
Адзін жа княжыч
Пакарыў каханку,
Яе назваўшы
Любаю сваёй.

Гавораць, гэта
Быў той княжыч Лада,
Што родам з нашых
Бесядскіх краёў.
Прыгожы, статны,
Спрытам і спагадай
Любоўю ў сэрцы
Абудзіў любоў.

Сваю ён зорку —
Чараўніцу Хоцю —
З-пад кручаў Сожа
Да сябе прывёз,
І ўстаў з легенды
Гарадок наш Хоцімск,
Дзе зоры ў Бесядзь
Падаюць з нябёс.

І падаюць,
І узлятаюць зноўку,
Ў начных нябёсах водзяць карагод,
Пасля ператвараюцца на золку
Ў святло зары,
У сонечны усход.

Між іх адна
Ярчэй за ўсіх палае,
Над самай нашай Бесяддзю гарыць.
Гавораць, гэта
Хацім'я ўсплывае,
Якой змог княжыч
Хоцімск падарыць...

Было ці не было,
Але кахання
Агонь — непадуладны ён вякам...
І я паводле даўняга падання
Пісаў баладу гэту землякам.

Лістапад 1987 г.



## БЕСЯДСКІЯ ВІРЫ

### Паэма

Паэт з маленства бачыць на ўвесь век.
*Віктар Шклоўскі*

На вёрстах дальняга паходу
Не зарастуць быллём сляды.
Зары двухтысячнага году
Перадаю свае гады.

А ці ж забыта сцежка тая,
Якой прайшоў упершыню?
Яна сама лісткі гартае,
Не падуладныя агню.

Яна ўлівалася ў дарогу,
Што самай цяжкаю была,
Праз горыч,
Смерць і Перамогу
З салдацкай доляю вяла.

Цяпер вядзе
Пад мірным сцягам
Праз шыр палёў,
Лясоў і рэк.
І стала мне
Жыццё працягам
З былога веку
Ў новы век.

Жыццё ідзе.
І ў мужным кроку
Я маладосць пачуў сваю,
Нібыта ў школе на уроку
Адказ настаўнікам даю.

Не апушчу прад імі вейкі:
Пачуцці ёсць, і слых, і зрок.
Хто ж за мяне
На схіле веку
Правесці зможа мой урок?

Пазычу ў ветру волі, сілы,
У сонца — ласкі і цяпла,
Каб пакрыляць за небасхілы
І зноў вярнуцца да жытла —

Да той хаціны, дзе бруяцца
Віры пад меддзю жалудоў.
У белабрысае юнацтва
З сівых вяртаюся гадоў.

Туды, на дзедаву палоску,
На луг, у звонкія бары.
Як мы любілі нашу вёску
І нашай Бесядзі віры!



Ўсе раслі бацькі і брацці
Ў нашых бесядскіх краях.
Пачалася ў гэтай хаце
Радаслоўная твая.—

Ён ківаў рукой на садзік,
Што дыміўся за акном:
— Тут і дзед твой
І твой прадзед
Адным хрышчаны крыжом...

У святле чырвонай даты
Ажыўлялася сяло.
Ды ад бацькі — ад салдата —
Доўга вестак не было.

Ну, а маці? Шчэ малою
Прала кужаль для паноў.
Пра бацькоў, пра іх былое
Ведаў з дзедавых я слоў.

Між сабой дзялілі роўна
Хлеб, здабыты мазалём,
І сям'ёй адзінакроўнай
Будавалі мы свой дом.

Ды над рэчкаю Альшоўкай,
Сустракаючы вясну,
З самаробнаю вінтоўкай
Не гулялі мы ў вайну,



Каля Хоцімска старога
Вёска нашая стаіць.

Рэчка ціхая Альшоўка
Праз пярэсты льецца луг.
Ад жывога ў лузе шоўку
Зелянела ўсё наўкруг.

Паглядалі людзі з вёскі
На лужкі паміж дарог.
Асыпаліся пялёсткі
З белых яблынь на мурог.

Золак весні над хацінай
Плыў у радасці й мальбе.
А нас клікаў пад каліны
Луг зялёны да сябе.

Ветру,
                сонцу адзываўся
Звонкай песняй родны кут.
З братам —
Пруднікавым Васем —
Шчаўе мы шчыпалі тут.

Дома быў парою весняй
Хлеб даедзены ўжо наш.
Тое шчаўе з лугу неслі
Прадаваць мы на кірмаш.





Кошык нейкае бабулі
Насыпалі за пятак,
А пасля куплялі бублік,
Каб з кваском пад'есці ўсмак.

А яшчэ больш мы хацелі
Праляцець святочным днём
На драўлянай каруселі
З размалёваным канём.

Неспакой бацькоў штодзённы
Пра сябе і пра дзяцей...
А мы зноў —
На луг зялёны,
Шчаўя каб нарваць паўней.

А ці зналі, што на ўзмежку,
Каля самае ракі,
Развінуцца нашы сцежкі,
Як вось гэтыя радкі?



**МАЯ РАДАСЛОЎНАЯ**

У цішы вясковай хаты
Я сіроткай падрастаў,
У тым годзе, у дваццатым,
Мне мой дзед
За бацьку стаў.

Ён мяне «малою крошкай»
З мёртвай маці падымаў.
А яго чамусь
Мардошкай
Кожны ў вёсцы называў.

Я пра іншых мала ведаў —
Што за людзі, як жывуць?
— А чаму Мардошкай, дзеду,
Ў вёсцы ўсе цябе завуць?

Дзед ціхутка на палічку
Ставіў конаўку з вадой:
— Ат, хтось даў такую клічку,—
Пасмяяўся над бядой...

Неяк селі мы вячэраць,
І, калі ён рукі мыў,
Мне сказаў:
— А ты не вер ім,
З роду Пруднікавых мы.





Ўсе раслі бацькі і брацці
Ў нашых бесядскіх краях.
Пачалася ў гэтай хаце
Радаслоўная твая.—

Ён ківаў рукой на садзік,
Што дыміўся за акном:
— Тут і дзед твой
І твой прадзед
Адным хрышчаны крыжом...

У святле чырвонай даты
Ажыўлялася сяло.
Ды ад бацькі — ад салдата —
Доўга вестак не было.

Ну, а маці? Шчэ малою
Прала кужаль для паноў.
Пра бацькоў, пра іх былое
Ведаў з дзедавых я слоў.

Між сабой дзялілі роўна
Хлеб, здабыты мазалём,
І сям'ёй адзінакроўнай
Будавалі мы свой дом.

Ды над рэчкаю Альшоўкай,
Сустракаючы вясну,
З самаробнаю вінтоўкай
Не гулялі мы ў вайну,



Як гулялі тут з абрэзам
Стыфанцовы — хлапчукі:
Ў іх усё — вазок жалезны
І адменныя канькі.

Ганарыстая, як быццам,
Хочуць той парэзаць лёд.
Ім ад нас адгарадзіцца
Памагаў высокі плот.

У мяне ж — ніводнай цацкі,
Мне ніхто іх не купляў.
На гульню дзяцей кулацкіх
Я з-за плота пазіраў.

І аднойчы нацкавалі
На мяне яны сабак:
— Гэй! Кусай яго! — крычалі,—
Ён — байструк, а не дружбак.

Пра майго пра бацьку штосьці
Наплявузгалі яны:
«Ён сабакам сена косіць,
Не вярнуўшыся з вайны...»

Я не плакаў, хоць балюча
На маёй было душы.
— Не крыўдуй на іх, унучак,—
Дзед казаў мне.— Адкажы
Кулаком ім, крыкні:





«Самі
Байструкі вы — горш другіх...»
Я адказваў не слязамі —
Ад сябе адпіхваў іх.

Ведаў шмат ужо ад дзеда
Я пра бацьку-бедняка:
У жыцці шмат гора зведаў
З горкім хлебам прымака.

З Ліпаўкі — суседняй вёскі —
Малады, худы наўздзіў,
Праз лугі, палі і плёсы
У Альшоў гуляць хадзіў.

Хоць з васьмі дачок сям'я ўся
Жыла ў дзедавым кутку,
Ды ў Марыну закахаўся —
У малодшую дачку.

Дзед заўважыў узаемнасць
У каханні. І сказаў:
— Што ж, жывіце!
Мне прыемна,
Што адзін вас лёс звязаў...

Праз паўгода навабранцам
Бацька мой пайшоў на фронт.
Уначы з паходным ранцам
На плячы нёс кулямёт.

Дым яму акопны ў вочы
Біў на снежнай цаліне...
Мо з пялёнак тою ноччу
Ў свет выносілі мяне?

Фотакартак бацькі, маці
Ў нашай хаце не было.
Хто тады сфатаграфаваць іх
Мог? —
І ў голаў не ішло...

Я не помню, як з вайною
К нам яшчэ бяда прыйшла,
Як за матчынай труною
Йшло амаль што паўсяла.

Маладой, казалі, маці
І прыгожаю наўздзіў
Дзве начы ляжала ў хаце,
Калі люты ў полі выў.

Гора ў хату лезла прама,
Як гадзюка па кустах.
Дзед за тату, і за маму
Нёс унука на руках.



## НАС ВЯДЗЕ АДНА ДАРОГА

Асыпалі лісце долу
Дрэвы восеньскай зарой,
Не пусціў мяне у школу
Дзед чамусьці той парой.

Я не нёс з сабой паленца
І сякі-такі абед.
Не выходзячы і ў сенцы,
На парозе кажа дзед:

— Што ж,
Пара за розум брацца —
У настаўніцы сваёй
Ты не толькі распісацца
Навучыся, ўнучак мой!

Труд — навука, каб зямля ўся
Хлеба-солі больш дала...
Можа, дзед і памыляўся,
Але праўда ў ім жыла.

Сам ён толькі ў дні разводдзя
Шапку вешаў на кручок,
З бабкай Настай жыў у згодзе —
Восем вырасціў дачок.

«Хай жывуць, растуць!» —
Сам-насам

Разважаў, без лішніх слоў.
Бабцы скардзіўся ён часам,
Што не мае ён сыноў...

У сям'і адны дзяўчаты,
Ў маладыя шчэ гады.
І яны ад роднай хаты
Разышліся — хто куды.

Павыходзілі ўсе замуж,
Мае кожная сям'ю.
Шкадаваў маю дзед маму
І любіміцу сваю —

Прыгажуню, працаўніцу,
Маладзейшую дачку,
Не паспеў і надзівіцца
На яе ў сваім кутку...

Пахаваў дзед бабку Насту
І — адзін, нібы без рук...
Як адзін?
У хаце нас тут
Двое сёння — дзед і ўнук.

Заявіў стары, што ўнука
Сам ён будзе гадаваць,
Немалую дасць навуку,
Бо навучыць працаваць.



І на скрыпцы граць, якую
З маладых бярог гадоў.
Шкадаваў, што век вякуе,—
Па душы нідзе такую
Не знайшоў паміж удоў,

Каб яму сяброўкай стала
Пад канец жыцця ў двары.
Там пячэ ён хлеб
І з салам
Навучыўся суп варыць.

На мяне яшчэ надзея.
Я — яго нашчадак, кроў.
Ну, а бацька мой!
А дзе ён,
А ці вернецца ў Альшоў?

А ці прыйдзе ён дадому
Стуль, дзе лютая зіма?
Мо яму шчэ невядома,
Што матулі ўжо няма.

Калі й вернецца — не будзе
Жыць далей у прымаках.
Ну, а дзед мяне
Пры людзях
Аж насіў бы на руках.

## РОДНАЯ ШКОЛА

Шлях руччы сабе прабілі самі,
Пацяклі дарожнай каляёй.
А мы ўслед гурбой за ручаямі
Бегаем па вуліцы прамой.

Дзесь грукочуць на дарозе колы.
З дзён далёкіх праз усе часы
Вуліца
Адным канцом да школы,
А другім —
Ішла ў палі, лясы.

Цераз вёску ўсю
На ўсход і захад
Лёг удаль наезджаны бальшак.
Школа наша —
Пад чырвоным дахам —
Бы адзін прыземісты барак.

Ды яшчэ ля гэтага вось дома
Ёсць пад бляхай
Стыфанцовых дом.
На астатніх —
Вечная салома:
Стрэхі хат, парослыя імхом.

Не багата ўсе жылі альшоўцы,
З кузняю адной на сельсавет...



А для нас,
Маленькіх пачаткоўцаў,
Наша школа —
Ўвесь багаты свет.

Пра мяне, сіротку, не забыла
Першая настаўніца мая.
Добрая жанчына —
Ўгаварыла
Дзеда, каб далей
Вучыўся я.

Як прыемна нам ва ўтульным класе
Быць адною дружнаю сям'ёй,
І ў далёкім,
І ў надзённым часе
З дарагой настаўніцай сваёй.

Вучыць Кацярына Фамінічна
Нас пісаць, чытаць.
Але найперш
Патрабуе — гэткі меўся звычай,—
Каб на памяць
Прачытаць ёй верш.

Ганарымся ж яшчэ тым усе мы:
Стаў паэтам Фамінічны сын.
Малады, а, кажуць, склаў паэму
Пра свой край,
красу яго далін.

Мо і мы сваё тут слова скажам,
Калі самі крыху падрасцём?
А сягоння з сумачкі сярмяжнай
І яго мы кніжку дастаём.

Напісаў паэт наш,
Як палоску
Трактар падхапіў
І ў даль панёс.
Гэта песня і пра нашу вёску,
Пра яе жыццё,
Сялянскі лёс.

Як ён шчыра, вобразна і проста
Апявае працу на палях!
Перад намі
Яшчэ будуць вёрсты
Раскрываць усёй зямлі абсяг.



## ПЕРАД ВЕЧНАЙ ПАМЯЦЦЮ

Красавік маладою травою
Прабіваўся з адталай зямлі.
Сёстры-цёткі з сваёю куццёю
Памянуць маю маці прыйшлі.

Завіталі у хату й суседзі —
Ўсе, хто гора дзяліў разам з ёй.
На нязваным жалобным абедзе
Мы сядзелі адною сям'ёй.

Цёткі селі за стол
Пад ікону,
Лыжкай посную дзеляць куццю.
Не забуду ніколі да скону
Іх малітвы і смерці й жыццю.

Цётка Ксення
Малога карміла
Тут сваімі грудзямі мяне.
Палічыла —
Расказваць няміла,
Як сястру яе неслі ў труне.
Кажа:
— Наша сям'я знітавана
Непарыўнаю ніццю адной.—
І яшчэ вось адна
Цётка Ганна
Побач ціха прысела са мной,

Дастае з карабка падарунак —
І кашулю й штаны з палатна,
Што пад колер зялёнае руні
Мне і ткала, і шыла сама.

— Паглядзі,—
Дзеду ціха сказала,—
Твой унук —
Бы сявец на сяўбе.
Ты даруй, тата, мне,
Калі мала
Памагала ў рабоце табе.

Не крыўдуй на мяне і за тое,
Што ў цябе брала ўнука з-пад рук,
Ён — бы сонейка нам залатое,
І не толькі адзін твой унук...

Дзед свой кінуў пагляд:
— Ты, Ганууся,
Мне не стаў тут клінок папярок!
Я, прымернае дзела, клянуся:
Для мяне Петрусёк —
Мой сынок...

Ну, а мне тут было не да ежы,
На куццю памахаў я рукой
І — на вуліцу
Ў новай адзежы,—
Не насіў яшчэ зроду такой...



## ВЯРТАННЕ БАЦЬКІ

Не ўсвяточвалі нам даты
Зоркі ясныя з нябёс.
Мне ярчэй
Год дваццаць пяты
Асвятліў нялёгкі лёс.

Ён, як белыя пыліны,
Снежнай сыпаўся зімой.
І не прывідам —
Былінай
Прада мною бацька мой.

Разглядзець было не проста —
Ці стары, ці малады,
Ён вышэй за дзеда ростам,
Толькі вельмі ўжо худы.

Я не знаю, як сустрэча
Ўскалыхнула ўвесь наш дом,
Толькі помню:
Позні вечар,
Лямпа ў хаце над сталом.

Бацька ўвесь абліты потам —
Быў так змораны ў хадзе.
І сляза цякла ў яго там
Па шчацэ, па барадзе.



Ён у тым дваццатым годзе,
Як ішла яшчэ вайна,
У далёкім быў паходзе,
Дзе другая старана.

І калі абвіты ў хаце
Чорнай стужкай быў парог
І маю хавалі маці,
Ён не ведаў і не мог
Прыкульгаць сюды з кавенькай,
Дзе лічыўся прымаком.
Ён не знаў, як сын маленькі
Жыў сірочым малаком.

Колькі часу прамінула,
Не забыў ён наш Альшоў.
Дзеда, бы нажом кальнула,—
Бацька
Па мяне прыйшоў.

Вось стаіць ён перад намі
І тлумачыць штосьці нам.
Дзед мацней мяне рукамі
Абхапіў:
— Не, не аддам!..

Ну, а бацька — ўвесь гарачы
І схуднелы ад бяды...
Ля стала стаіць і плача,
Дзеду кажа:





— Я сюды,
К вам, Іванавіч, не ў госці,
Я даўно б прыйшоў з вайны.
Але, бач, адны вось косці,
Як аб'едкі сатаны?

Як дазнаўся, што з Марынай,—
Дзед, нічога не кажы! —
Я ўсю ноч тут, ля адрыны,
Прастаяў, нібы чужы.

На магілцы быў, да хаты
Ўсё палохаўся прыйсці.
Ці ж у тым я вінаваты,
Што так выпала ў жыцці?

Знаеш сам, як ваявалі,—
Шмат у нас было палкоў.
Мы за Леніна стаялі,
Мы — за ўласць бальшавікоў.

За чужой спіной хавацца
Я з маленства не прывык.
Кожны з нас, хто мог змагацца,
Быў таксама бальшавік.

Лёс няўмольны — і з такою
Напаткаў бядою ён:
Пяты год ужо спакою
Не дае мне той палон,

Як захоплены чужынцам
На чужой быў старане.
Верным быць сваёй Марынцы
Я хацеў —
Паверце мне.

Гаварыў так бацька з болем,
Што абпёк усю душу...
Раздаваўся дзесь над полем
Адзінокі вербаў шум...

Прымаком жа, як нядаўна,
Бацьку дзед прыняць не мог,
І сказаў яму:
— Была ў нас
Тут адна б сям'я, дальбог.

Толькі ж, бачыш, гора злое
Па табе прайшло й па мне...
Я расціў дзіця малое,
Калі быў ты на вайне.
Гадаваў без бабкі, маці
І карміліцу наймаў,
Як малое птушаняці,
На руках яго гушкаў.
Як жа я аддам сіротку,
Каб у мачыхі ён жыў?..
Доўга вечар той кароткі
Ў полі воранам кружыў.



**СУСТРЭЧА З ПАЭЗІЯЙ**

Вечар быў. Знікалі цені.
Школа нас сабрала ў гурт.
Ну, а Вася, мой браценік,
Заявіўся першым тут.

Да вучобы, працы здатны,
Стаў надзейным дружбаком.
І ў вучобе, як выдатнік,
Марыць стаць ён мастаком.

Пра Аркадзя Куляшова
Ён даведаўся, што той
Заўтра з нашага Альшова
Ад'язджае раніцой.

Вершы склаў пра нас,
Пра маці,
Пра касмічны рух планет,
Пра свае гады, пра шчасце
І пра свой юнацкі свет.

Рады мы, што ў нашай школе
Злюбаваў сабе ён дом.
Ціхі вечар слаўся ў доле
Белым росным туманом.

Вішня цветам забуяла,
Развінуўшы голле ўшыр.

Рэчка ціха размывала
Ў берагах пажоўклы жвір.

Мы стаялі каля брамы,
Дзе ўкрывала дол сасна.
А паэт, раскрыўшы раму,
Паглядаў з свайго акна.

Можа, нечым быў расчулен —
Кнот у лямпе падкруціў.
А мы бачылі і чулі,
Як па хаце ён хадзіў.

Чутна нам, як у пакоі
Раздаецца ціхі крок.
О, здзіўленне нам якое!
Піша ён пра наш куток:

«Расцвілі мае сады
Над шырокаю дарогай,
Песень шчасныя лады
Сэрца кратаюць трывогай.

Гэты час, і гэты свет,
І квятлівы водар гэты —
Ўсё ацэньвае паэт,
Як вясновыя прыкметы».

Пaглядалі са здзіўленнем
На свайго мы земляка.



Хто мог ведаць
Пра натхненне,
Што жыве
Ў яго радках?

Праз акно з свайго пакоя
Нас паэт не заўважаў...
О, якія дні, якое
Шчасце ўсім нам лёс паслаў!

Стаў ён нам паэтам першым,
І не кніжным,
а жывым,
Бо пра нас пісаў ён вершы
Ў краі бесядскім сваім.

Нам пасля такой сустрэчы
Захацелася самім
Напісаць пра весні вечар,
Як нам добра жыць усім...

Спытку з белае паперы
Месяц даў яшчэ б святла.
Ды не стукнулася ў дзверы
Муза, штосьці не прыйшла...



**КОНЬ МОЙ ШПАРКА БЕГ...**

Шумеў у працы, Бесяддзю абмыты,
Увесь Альшоў,
Усе мы разам з ім
Рабілі тут і рэшаты, і сіты —
Рашэтнікі, вядомыя усім.

Але такіх у нас было нямнога,
Больш палавіны вёскі —
Беднякі.
Нас кожны дзень вяла туды дарога,
Дзе поле, луг, палоскі і ляскі.
Як ні імкніся хлеба назапасіць —
Яго хапала толькі да каляд.
Таму —
Жывёлу хтось наймаўся пасвіць,
Хто на мястэчка свой кідаў пагляд.

Дзе талакою будавалі хаты,
Дзе памагалі паласу ўзараць.
Галоўная ж прафесія —
араты:
Ім нарадзіўся, ім і паміраць...

Мы невялічкую палоску мелі
І завіхаліся на ёй штодня.
Але праз колькі год
Разбагацелі,
Бо дзед купіў у цыганоў каня.





Не надта ўжо імклівага —
Такога,
Што мог і плуг і барану цягаць.
Звычайны конь,
А для мяне, малога,
Здаваўся ветрам,
Што запыльваў гаць.

Мне помніцца:
Вясна ішла раздоллем
І заглянула ўжо на наш парог.
Мой дзед, паставіўшы каня ў аглоблі,
Яго тым ранкам у вазок запрог.

І пабудзіў мяне да сонца ўсходу:
— Ўставай, унучак!
Ходзь хутчэй сюды!
Памыўся я і з'еў перад «паходам»
Паўмісачкі ўчарашняй лебяды.
Яе не надта часта мы варылі,
Паўчыгунка хапала на дзянёк.
А тут і пеўнік з паламаным крыллем,
Хоць і шкада, паплыў у чыгунок...

Дзед мне саломкі падсцяліў старанна
І пасадзіў,
Каб мне было лацвей...
На самым золку
Я — яшчэ заспаны —
За лейцы ўзяўся пругкія мацней.



Як гной у полі скідваць —
Я ўжо ведаў,
Рабіў усё, што мне наказваў дзед.
— Ты бачыш, вунь
У поле людзі едуць?
Не адставай,
Гані за імі ўслед!

А там глядзі,
Каб на сваю палоску —
Не на суседскую, раскінуў гной!
Упершыню так праз усю я вёску
Праехаў гулка роднай стараной.

Мне назаўсёды стаў
Той дзень працоўны
Мо самым светлым,
Незабыўным днём,
Бо не на жарт, хлапчук,
Як роўны з роўным,
Там падружыўся я з сваім канём.

Ён ад вясны са мной да лістапада,
Пакуль не выпаў на дарогу снег.
І кожны вечар быў я надта рады
Вадзіць яго за вёску на начлег.

Заўсёды быў мой конік паслухмяны,
Калі яго ў аглоблі запрагаў.
А на начлезе — толькі ўзыдзе ранак —
Сам да мяне ён з лесу выбягаў.





Імгненна я развязваю стрыногу,
Падводжу коніка бліжэй да пня.
І з лесу, з логу
Мчымся на дарогу.
Няма нідзе шпарчэйшага каня.

Як толькі я
Ўвап'юся ў пасмы грывы,
Адчуе ён цяпло хлапечых рук,
Яшчэ шырэй свае расправіць крылы
І капытамі толькі стук ды грук.

Пярэдніх коней нават абганяем,
Вунь за спіной ужо шырокі шлях...
А потым ноч начлежную змяняе
Дзень працы,
Ўпартай працы на палях.

## НАРАДЖЭННЕ ПЕСНІ

Вецер зноў гамоніць з голлем,
Атрасаючы расу.
А я крочу лугам, полем —
Быдта ў сэрцы іх нясу.

Спеў птушыны раздаецца
На рацэ, ў лясной глушы.
Песня ўжо сама, здаецца,
Вырываецца з душы.

Прыгадаў я зноў той вечар,
Як паэт складаў радкі.
Ўсхваляваны быў ён нечым.
Ну, а я?
Ля той ракі,
Шчаўе дзе шчыпаў на лузе,
Чую ціхі шум гаёў,
Птушак спеў.
І стала Музе
Блізкім слова і маё.
«Бег — начлег» —
Адкуль, што гэта?
Да мяне свой блізіць крок
Тая Муза, што з паэтам
Крочыла з кутка ў куток.

Хоць зусім я ведаў мала
Пра паэзіі узлёт,



Але Колас і Купала
Нам вядомы з першых год.

Так пісаць аб родным краі,
Аб любімай старане:
«Бо як песню заспяваю —
Жаль вам душу ўскалыхне...»

Пра начлег, канька гнядога
Расказаць хачу я ўсім,
Каб дазнаўся свет, як многа
Прыгажосці ў свеце тым.

Хай усе пачуюць людзі,
Што ў маёй вірліць душы!
Кажа сэрца:
«Ты пра будзень
Свой, як можаш, напішы,

Як смяяўся, часам плакаў,
Рады даць сабе не мог,
Калі горкім небаракам
На чужы ішоў парог...

Напішы пра Стыфанцова,
Як цябе папружкай біў.
Не,
Скажы ад сэрца слова,
Як каня ты палюбіў.

Напішы, як хлопцы едуць
На начлег, як спяць стрыжы
Над ракой.
Пра бабку, дзеда
І пра маму раскажы...»

Так сяджу каля сцяжынкі,
Бачу хмарку над сабой.
І пра нешта мне былінкі
Ціха шэпчуць пад вярбой.

Верабейчык крыллем пругкім
Трапянуўся ля рукі,
Не заўважыў сам, як хутка
Ў сэрцы скларіся радкі:

«О, як хараша, як добра
Вадзіць коней на начлег!
Сёння з лесу шляхам доўга
Конь мой рыжы шпарка бег...»



## ДЗЕД МЯНЯЕ ПРАФЕСІЮ

Дзед старэе.
От сядзіць пад ліпкай,
Прыгадаў, як на сваім вяку
Весяліў народ вясёлай скрыпкай,
Скрыпка тая —
Зараз на цвіку.

Адшумелі, адгулі вяселлі,
Не пяе насмылены смычок...
— Што ж мы тут у прыцемку заселі,—
Кажа дзед,—
Трэ працаваць, сынок!

Будзем іншай справаю заняты,
Папрацуем крыху на двары...
Незабыўны ранак
Светлай датай
І на нашым лёг календары.

Зашумелі пад блакітам веснім
Травы, дрэвы, ціхія садкі.
Выбраў дзед
Яшчэ адну з прафесій —
З гліны ён
Пачаў круціць гаршкі.

Ён з юнацтва ў некага вучыўся,
Прывучаў да справы і мяне,

Каб ганчарнай працай задзівіўся
Месяц сам у нашай старане.

Каб свяціўся, як з нябёс свяціла,
Кожны дзедам выліты гаршчок.
Вёска ўся пра дзеда гаманіла:
«Вось табе, глядзі, і мужычок!

Можа ўсё ён —
І сыграць на скрыпцы,
І для місак фарбы з неба браць...» —
Не хацеў мой дзед спачатку быццам
Ганчаром быць —
Лепш зямлю араць...

Але як жа людзям абысціся
Без гаршкоў, што сохнуць у дварах?
І пайшла работа.
Задзівіўся
Кожны працай дзеда-ганчара.

Кожны раз яшчэ да сонца ўсходу
Мы ўстаём.
Мы з дзедам «на нагах».
На дарозе гулкай скрып падводаў
Рассыпае з пылам дзёгцю пах.

З іншых блізкіх і далёкіх вёсак
Ганчары спяшаюць на кірмаш.
Коні ржуць. І ржання адгалосак
Залятае ў «цэх» ганчарны наш.



Да сябе і нас кірмаш паклікаў,
Каб хутчэй сваю капейку мець,
І не толькі сплесці лапці з лыка,—
Чаравікі добрыя займець,

А замест саломы — дах цынковы,
Боты мо і замест тых лапцей, што плёў...
Ну, а я, як хлопцы Стыфанцовы,
На рабфак паеду ў Магілёў?

Мне ляцець хацелася на кручы
За падводамі, за коньмі ўслед.
— Не спяшайся, пачакай, унучак! —
Гаварыў мне працавіты дзед.

На кірмаш і мы дарогай торнай
Пакацілі лёгкі свой вазок,
Каб на зерне, вартае для жорнаў,
Абмяняць адзін — другі гаршчок.

Па капейцы ад тых зерняў-каліў
Дзед збіраў рубель.
Пасля не кпіў,
Што кашулю новую з паркалю
За апошні грош ён мне купіў...

Я, малы, тады яшчэ не ведаў,
Людзі ў беднасці жывуць чаму.
Толькі бачыў —
Цяжкавата дзеду —
І я стаў падмогаю яму.



На мяне дзядуля не сурова
Паглядаў,
Маўчаў, скупы на слова:
Толькі скажа:
— Будзем жыць «на яць»,
Як пачнуць гаршкі у нас купляць.

Паглядзі, унучак!
Так вось трэба
Фарбаваць нам посуд,
Каб на дне
Тых гаршкоў адбіўся колер неба
Яшчэ больш ясней, чым у акне...

Паказаць майстэрства трэба люду,
І тады ён возьме выраб твой...
— Дзед, скажы,
І я рабіць так буду? —
У адказ ківаў ён галавой,
На мяне паглядваў задумённа:
— З гліны можна ўсё, сынок, зрабіць,
Не адны гаршкі —
Людзей імёны
З небыцця падняць і ажывіць...

Мы лічылі — праца ў нас пачэснай
І карыснай для людзей была.
Дзед мой — майстар. Хоча ваўначоску
Для ўсяго свайго зрабіць сяла.





**ПАСЁЛКІ, ПАСЁЛКІ...**

Плыў над вёскай вечар золкі,
А ў хаціне сход ішоў:
Загадаў хтось — на пасёлкі
Падзяліць стары Альшоў.

Усхвалёваны сяляне —
Беднякі й серадdespite.
— Нейкае размежаванне,
Кажуць, будзе, мужыкі.

А каму гэта патрэбна?
Ці ж не знаюць, гэты год
Стаў для вёскі ўсёй бясхлебным —
Быў у полі недарод.

Хто пытанне ставіць сёння,—
Не само ж яно ўсплыло? —
Прадстаўнік сказаў з раёна:
— Вельмі згушчана сяло.

Трэба вёску на пасёлкі
Падзяліць — такі загад!..
— Ну, а як на крываколках
Перавесці трыста хат?

Хтосьці крыкнуў ад парога:
— Запрагайся сам.— Але ж...
Прадстаўнік адказваў строга:
— Скажуць, дык перавязеш!..



У бары зязюлі раннем
Перасталі кукаваць.
Доўга думалі сяляне —
Як ім вёску падзяляць?

І каму які пасёлак
На якой дадуць зямлі?
Дзе пясок, а дзе падзолак —
Землі ж розныя былі.

Быў адзін Альшоў са школкай
І адзін на ўсіх пагост.
А цяпер — аж сем пасёлкаў —
Даўжынёю ў дваццаць вёрст.

Не хацелі ў тое лета
Разбівацца мужыкі.
Хто, калі, з якою мэтай
Зверху даў загад такі?

Мо жыццё такое ў радасць
Хутаранам-кулакам?
А ці ж трэба ўсім загаду
Падпарадкавацца нам?

Перамена, кажуць, хутка
Будзе нейкая і ў нас.
Па зямлі ўжо ходзіць чутка,
Што ўсе пойдзем у калгас.





Знікнуць нашыя палоскі
І лужкі каля ракі.
Дык навошта ж нашу вёску
Разбіваць на астраўкі?

Гэтак думалі сяляне.
А той зверху прадстаўнік:
— Ёсць загад такі. І сянні ж
Трэба ўсіх узяць на ўлік.

Хто ў якім з сямі пасёлкаў
Па-суседску хоча жыць...
Слухаў дзед, як той галёкаў,
І падняўся:
— Як жа быць

Са страхою саламянай,
Як сабраць яе ў кулькі?
І ці трэба, грамадзяне,
Нам мяняць свае куткі?

Рэвалюцыя дала нам
Волю, працу і зямлю.
Трэба нам, усім сялянам,
Мацаваць адну сям'ю.

І калі ўжо хто актыўнасць
Тут такую паказаў,—
Трэба йсці ў кааператыў нам,
Пра які Ільіч казаў.



Ува ўсіх адна ў нас праца
І адной зямлі дары,
Дык навошта ж разбівацца
На пасёлкі,
хутары?

Вось маё такое слова,
Бо раздзел — нам на бяду.
Вы як хочаце — з Альшова
Нікуды я не пайду!..

— Праўда, дзед! —
Хтось адазваўся.
— Жыць і мне ў сваім кутку! —
Дол пад хатай захістаўся.
Прадстаўнік прыўзняў руку.

— Ціха! —
Крыкнуў на ўсю хату,
Потым грукнуў па стале:
— Хто такі —
Дзед барадаты?
Кажуць, ваш ганчар?
Але...
Чуеце, пра што варожыць:
«Не пайду з свайго кутка...»
Гэта —
Яўны дух варожы,
Гэта —
Ноткі кулака!..—





Загудзела хата, ў поце
Прадстаўнік сцямнеў, бы рак.
— Гэй,
Лягчэй на павароце! —
Ну, які ж Яхім кулак?

Знаем, працаю якою
Здабывае хлеб Яхім,
Ён ганчарняю сваёю
Памагае нам усім.

Не чапай Яхіма словам,
Ён тут праўду гаварыў,
Лепш ідзі да Стыфанцова —
Той, напэўна, за разбіў.

Хоча ён адмежавацца,
Каб свой хутар атрымаць.—
Да начы гудзелі ў хатцы,
Вёску каб не разбіваць.

Не згаджаліся сяляне
Зносіць хаткі-катухі,
Напісалі нат пасланне
Ў Магілёў, бач, «у вярхі».

І праз тыдзень раным-рана
Вестка новая прыйшла,
Сельсавету загадана —
Не чапаць пакуль сяла.

## НЯПРОШАНЫЯ ГОСЦІ

Трыццаты год вясной гайдаўся
На грэбні веку ў шуме хваль.
Здавалася — плыве зямля ўся
З сівых глыбінь кудысьці ўдаль.

Трашчалі ўздыбленыя крыгі
Ля нас на бесядскіх вірах.
А я гартаў старонкі кнігі,
Што павяла ў далёкі шлях.

Яшчэ не ўсе ў той час вясновы
Мы запісаліся ў калгас,
Ну, а суседзі Стыфанцовы
Нібы былі ўбаку ад нас.

Яны з упартасцю чакалі:
А што яшчэ пакажа год?
Да нас чамусьці завіталі,
Калі ішоў сялянскі сход.

Іх за якуюсьці праяву
Мой дзед даўно не паважаў.
— А ты, Яхім, падаў заяву
Ў калгас?
— Пакуль што не падаў.

Мне штось нядужыцца, суседзе.
Але вось думаю падаць.



Само нішто не йдзе, не едзе,
І з неба нечага чакаць...

Сусед з махры зрабіў зацяжку,
Быў прасядзець гатоў да дня:
— І ты ў агульную упражку
Сам аддасі свайго каня?

Дзядуля нейкі сумнаваты,
Хоць свой пражыў сумленна век:
— Ці ж у мяне такі дастатак,
Ці ж поўны, як у вас, засек?

Дзед паглядзеў на Стыфанцовых.
«Грэх вам»,— сказаць бы ім працей,
Але не мoжа нават словам
Прагнаць няпрошаных гасцей.

Не проста ж нас прыйшлі адведаць,
Ці паспытаць тут лебяды...
Старэйшы зноў пачаў бяседу
І да мяне: — Ідзі сюды!

Якую кнігу ты чытаеш?
Пра камунараў? Ну, дык што ж?
Аб чым гаворыць кніга тая?
Ўсім у камунію?
— Нягож!

— О, ты хлапчук у нас разумны.
А ведаеш — схадзі на сход.

Табе сядзець тут з намі сумна,
А там жа вёскі ўсёй народ.

Я сам бы,— кажа барадаты,—
Пайшоў, ды штось ад поту ўпрэў...—
Дык вось чаму да нашай хаты
Прыйшлі, як дзед мой прыхварэў.

Гавораць мне, каб за дзядулю
Я пасядзець на сход пайшоў.
Мо чулі, як у пыльным гуле
Машына бегла праз Альшоў.

Там, кажуць, прадстаўнік з раёна
Апытваць будзе ўсіх сялян,
Шукае нейкага шпіёна,
Што наш разведаць хоча план...

Ужо сцямнела неба просінь
І змрок пакрыў сляды хады.
А Стыфанцоў мяне ўсё просіць,
Каб я на сход ішоў туды.

— Дык ты ідзі, людзей паслухай,
А потым нам пра ўсё скажы.—
Я помню, як тытун ён нюхаў,
Ускінуўшы вачэй нажы...

Я выйшаў з хаты. Шмат народу.
На кінафільм «Лясная быль»



Ідзе сусед Ігнат са сходу,
Свой набакір надзеўшы брыль.

Пад ногі кінуўшы цыгарку,
Мяне ён тыцнуў злёгку ў бок:
— А ты куды імчышся шпарка?
Ідзі дахаты, Петрусёк!

Газета вось,— сказаў мне шчыра,—
На, свайму дзеду пакажы! —
Па-над ракой у жоўтым жвіры
Ўжо спяць апоўначы стрыжы.

Дадому я вярнуўся позна.
У нас ледзь тлее аганёк.
І Стыфанцовы просяць слёзна:
— Ну, раскажы нам, Петрусёк!

Ці выступалі навасёлы,
Ці гаварылі што пра нас?
А як наконт курэй, жывёлы?
Ці забяруць усё ў калгас?

Напэўна, столькі запытанняў
Мне і настаўніца мая
Не задавала, як заданне
Дамашняе выконваў я.

А тут? Ну, што яны за дурні?
Што я магу ім адказаць?

Лепш прасядзець у смалакурні,
Чым горкі дым іх удыхаць...

Датлелі іскры на цыгарках,
І сціх на вуліцы народ.
І ўжо ў хаціне ў нас агаркам
Пачаў капцець у лямпе кнот.

Я апускаю долу вочы,
Нібы хтось шэпча: «Не кажы!»
І зноў прабіць мне сэрца хочуць
Вачэй два вострыя нажы.

— Чаго маўчыш? Няўжо маўчалі
Усе на сходзе, як вось ты? —
Перада мной, як на прычале,
Абрыў загойдаўся круты.

— А што ў цябе, унучак, гэта? —
Пагляд ласкава кінуў дзед.
Была ў руках маіх газета,
Якую даў мне наш сусед.

Чытаць яны газету сталі,—
Туман над імі павісаў.
У той газеце І. В. Сталін
Штось пра калгасы напісаў.

Пра тыя спрытныя галовы,
Што ад гарачых пухлі слоў,



Які ў нас поспех адмысловы
Стаў ад кружэння тых галоў.

Я чуў пра тыя разважанні,
Хоць і не ўсё ў іх разумеў.
А Стыфанцоў жа за маўчанне
Мяне вачыма ледзь не з'еў...

* * *

Шапку рыжую павесіў
У парозе я на крук.
Але раптам каля весніц
Мы пачулі нейкі стук.

Стыфанцоў пачаў нагамі
Хутка з хаты церабіць.
— Вы куды? Ідзёмце з намі!
Вам тут нечага рабіць.

Голас свой чэкіст павысіў,
А другі, што з ім прыйшоў,
Кажа проста:
— Вас — на высел!
Пакідаць вам свой Альшоў...

Адышоў бліжэй да печы,
Дзе стаяла качарга:
— А ты, дзед, маўчы! Дарэчы,
Дойдзе й да цябе чарга.

З кулакамі сувязь маеш,
Прыклад з іх бярэш, як жыць.
Кажуць, золата хаваеш —
Дзесь пад печчу тут ляжыць.

Дзед стаіць, бы анямелы,
Галаву ніжэй схіліў:
— Я, сынок, прымерным дзелам,
Тое золата й не сніў.

Хоць гаворыцца спрадвеку:
«Не багам гаршкі ляпіць»,—
Хто ж мне стане, недарэку,
Золатам за іх плаціць?

Доўга штосьці ім тлумачыў
Дзед сівы — ганчар стары,
Як цярпелі ў нас няўдачы
І другія ганчары.

Госці быт наш небагаты
Пад увагу не ўзялі.
Стыфанцовых з нашай хаты
Ў ноч кудысьці павялі...



## НА ЎРОКУ ГІСТОРЫІ

Ішла вясна.
У ранні часе,
Калі адтрэскаў крыгаход,
Настаўнік нам у пятым класе
Чытаў пра Неўскага паход.

Ды вестка з захаду грамамі
Да нас данеслася здалёк.
І ўжо ішоў не па праграме
У нас гісторыі урок.

Перапыніўшы сказ пра даўні
На Чудскім лёдзе гул і трэск,
Пачаў расказваць нам настаўнік
Пра страшны ў Лейпцыгу працэс.

І, расхінуўшы ўшыркі голле,
Загаманіла ў нас вясна,
А нам прымроілася ў школе
Другая — тая старана,

Дзе для мільёнаў немцаў мукай
Гатоў быў стаць лёс ракавы,
Дзе многім свастыкай-гадзюкай
Агортваў Гітлер рукавы.

Там трэці ці чацвёрты тыдзень
Над Дзімітровым суд ідзе.



I хоча фашыстоўскі злыдзень
За праўду асудзіць людзей.

Адтуль папахвае вайною,
I людзі ў краі тым сваім
Апутаны хлуснёй, маною,
Што пагражае ім самім.

Фашыстаў зграя і ў народзе
Ўсім павуцінне там звіла.
Кліч Дзімітрова ўжо даходзіць
Стуль і да нашага сяла.

Ягоных слоў палёт агністы
Лунаў далей, па ўсіх краях.
Ён на лапаткі клаў фашыстаў
За іх ману пра свой рэйхстаг.

Герой балгарын знаў дарогу
Да соцень, тысяч змагароў...
Так сэрца мужнага трывогу
Перадаваў нам Дзімітроў.

Ён словам біў у твар сваволлю:
«Прыйдзе да вас расплаты час!..»
Ішла вясна
Лясамі, полем
З надзеяй светлаю да нас.

Жылі мы тою ўсе надзеяй,
Што ў ясным сонцы





Знікне змрок.
Стаў незвычайнаю падзеяй
Нам па гісторыі урок.

Ці знаді мы, што давядзецца
I нам прыйсці
Ў Берлін, туды,
Дзе сцяг наш
Полымем заб'ецца,
Асудзіць цемру назаўжды?



## ХАЛОДНЫ ЛЁД

Першыя праз Арктыку палёты,
Першыя на полі трактары.
І юнацтва праз дажджы, сумёты
Церабіла шлях з тае пары.

Гэты шлях з нябёсаў новай зоркай
Азарыў нам чкалаўскі палёт...
Толькі многім, нібы соллю горкай,
Лёг на раны той нялёгкі год.

Як вада, як лёд ён быў халодны.
Кожны дзень недаядалі мы.
Да таго ж — такія непагоды
І такія частыя грамы!

Ці спякота, ці то ліўні льюцца,
Ці то градам хмары сыпануць,—
Не паспееш часам аглянуцца,
А ўжо цені новыя паўзуць.

Гром прагрукаў і па нашай школе,
Як закончваў я ўжо сёмы клас.
Хтось шукаў тады і ў камсамоле
Ворагаў народа сярод нас.
Камсамольцы ўсе і камсамолкі
Нават спрэчкі, дыспуты вялі.
Справаздачы мы давалі, колькі
Ўдарнай працай хлеба здабылі.





Часам, як параненыя птушкі,
Ціха долу падалі з-пад хмар.
Але надта трапныя частушкі
Пасылалі мы сябрам у твар:

«Воду чэрпала вядзерцам —
Вада разліваецца.
Пакахала хлопца сэрцам —
Сэрца разрываецца.

Мы чужыя стрэхі ўзводзім,
А свае залатаны.
Да чужых мы дзевак ходзім,
А свае заплаканы.

Назаві мяне як хоч —
Не мазоль мне толькі воч.
Хоць крывая бярэзіна,
Ды здалёку везена.

Танцавала «сербіянку»
І скакала гапака.
Палюбіла дужа Янку,
Кажуць, сына кулака.
Ну, які ж Іван кулак,
Калі любіць мяне так?..»

Так ішлі з бацькамі мы ў суполлі
З дзён юнацтва ў сталыя гады,
На заводах, на калгасным полі
Пракладалі мы свае сляды.

Быў і я ў сваёй хадзе рухавым
І адданым справе юнаком.
Але вось за нейкія «праявы»
Ў камсамольскі павялі райком.

Перад гэтым актывісты школы
Ўсю радню праверылі маю:
Ці не здзейсніў нейкае крамолы,
На ідэйнай глебе ці стаю?
За ідэйнасць я не хваляваўся,
Бо ўжо вёска ведала мая ўся:
У калгасе добра працаваў
І насценгазету выпускаў.

— А чаму? — ў райкоме запыталі,—
Ты хадзіць на сходы перастаў?
Як пісьмо мы Сталіну чыталі,
Ты крадком Ясеніна чытаў?..

— Так, чытаў!
— А хто такі Ясенін? —
Хуліган ён і кулацкі сын...
Прызнавайся —
У сваім імкненні
Распаўсюджваў зло ты не адзін?

Намсакратара Барыс Афонаў
Чалавек тады быў малады,
Але столькі нам нанёс урону,
Што не злічыш, пэўна, за гады.



— Бачыце,— узяў насценгазету
Тую, дзе свой вершык я змясціў,—
Што ён піша у сваіх куплетах?
Вось паслухайце, які матыў:

«Узрасла культура ў роднай вёсцы,
Бо пісьменным стаў ужо мой дзед.
Дык няхай жывуць ардэнаносцы —
І Гікала наш, і Галадзед!»

Чуеце? Ўслаўляе Галадзеда —
Ворага народа — вось каго,
А якога меў на ўвазе дзеда?
Пэўна ж, падкулачніка свайго...

Мне хацелася сказаць, што вершык
Быў напісаны яшчэ ў той год,
Як рэспубліка — адна з найпершых —
Атрымала шмат узнагарод...

А мяне вось лаюць тут за гэта,
Апраўдацца б я нічым не змог,
Але першы сакратар Шабета
Ад нападак тых перасцярог.

— Вы перагінаеце, таварыш! —
Кінуў ён Афонаву папрок.—
Камсамолец наш не блага марыць,
Хоць слабы яшчэ ў яго радок.

Што ж Ясенін? Лірыку такую
Варта нам бы пачытаць усім...—
І мяне ўжо меней атакуюць
На закрытым пасяджэнні тым.

Не было ж у чым мне прызнавацца,
І мяне не аддалі на здзек...
Лёсу ўдзячны, што маё юнацтва
Засланіў ад крыўды чалавек —
Той Шабета самы, што ў райкоме
Кіраваць не для кар'еры стаў:
Ён не раз бываў у нашым доме
І мае ўжо вершыкі чытаў.
Ён сказаў:
— Афонаву ахвота
Лыжку дзёгцю ў чысты мёд падліць.
Гэтак, братцы, можна «Дон Кіхота»
І «Вайну і мір» забараніць...

Камсамольца ганіць нам не варта,
Лепш пуцёўку ў тэхнікум дамо.
Ведаю — ён сам хадзіў па хатах,
Падпісаць каб тое ўсім пісьмо...

Пацішэла нібы ўсё наўкола,
Нават мухі быў чуцён палёт.
Неяк у райкоме камсамола
Размясцілі той халодны лёд...



## ПЕРШАЕ КАХАННЕ

Калі прыйшло яно —
Ці днём, ці ўвечар,—
Каб растрывожыць твой юнацкі лёс?
Ці ведаў ты,
Што з першае сустрэчы
Тваё каханне —
Саланей ад слёз?

Ты запрыкмеціў,
Як агеньчык свеціць
Яе вачэй, што ўпершыню спаткаў.
Яшчэ не знаў,
Што ёсць імя на свеце,
Якога ты яшчэ не называў.

Ніводнай прыгажуні ты чароўнай
Не заўважаў дагэтуль між дзяўчат.
І вось яна
Прайшла па сцежцы роўнай,
Дзе ты хадзіў не раз
Паўз ціхіх хат.

Адкуль яна з'явілася — такая?
Яе ж ніколі ў вёсцы не было.
Чарнявых воч
Усмешка залатая,—
А ты —
Нахмурыў юнае чало.

Ты на яе
Свой кінуў збоку позірк,
Абняў вачыма пругкі, тонкі стан —
І ўжо забыў,
Ці ранні час, ці позні,
І вочы нейкі засланіў туман...

Пасля дазнаўся,
Што яна з бацькамі
Прыйшла здалёк у нашу старану.
Пачаў радзей
Страчацца з сябрукамі
І толькі думаць пра яе адну.

Прыціх у школе,
Разважаць стаў меней,
На парту перасеў,
Каб быць бліжэй...
Пачаў адзін у клеці спаць на сене,
І мроіцца
Святло яе вачэй.

Апроч яе
Перад табой нікога,
Адна яна —
Як зорка ў сіняве:
Няма ні дня,
Каб не прайшоў дарогай
Паўз той хаціны,
Дзе яна жыве...



Ты ўжо дазнаўся,
Што завуць Марынай,
Яна — дачка «зажытачных» бацькоў.
А ты стаіш от
Ля сваёй адрыны
І свеціш, босы, латкамі штаноў...

Табе зайсці так да яе ахвота,
Але адвагі ў сэрцы ніякой.
Ёсць шмат сяброў,
Ды ўсюды адзінота
Табе ў душу ўсяляе неспакой.

А з кім яна?
А можа, іншы хлопец
Прызнаўся ўжо, што пакахаў яе?
Хай будзе так —
Табе ж цярпення хопіць,
Каб не раскрыць пачуцці ёй свае...

Яшчэ юнак ты, толькі ў сёмым класе,
Не атрымаў на сталасць атэстат...
А ці падумаў ты
Аб сваім часе —
Чыя яна дачка
І хто ёй брат?

Мінуўся год.
Ты пра сваё каханне
Яшчэ нікому слова не казаў,

А хтось плявузгнуў,
Нібы з «панскім» званнем
Дзяўчо,
Якое шчыра пакахаў...

Табе сказалі,
Што яна — кулачка.
На твары ж не напісана, чыя...
Эх, доля, доля горкая твая,
Табе і жыць не хочацца, юнача.

Але жывеш,
Працуеш,
І мужнееш,
І набіраеш моцы з году ў год,
Пад сцягам тым,
Што над краінай рэе,
Табе ў вялікі хочацца паход,

Зрабіць што-небудзь важнае такое,
Ўзляцець да зор
Ці затушыць пажар.
Ну хоць бы раз
Прайсці па-над ракою
І прытуліць да шчок яе
Свой твар.

Пра тое мог сказаць тады ёй хіба,
Што мы пад культам узрасталі ўсе?..
Здавалася —



Не дапускалі хібаў,
Бо кожны з нас
Сцяг вернасці нясе.

Мы ўсе ішлі
Па выбітых дарогах,
Разводдзяў ніў
І перакатах рэк.
У тых няспынных баявых трывогах,
У радасці й слязах
Грымеў наш век.

І нат тады, пры многіх недахопах
І недастачах у сваім жыцці,
Мы неслі варту,
Каб да нас Еўропа
З фашысцкім крыжам
Не змагла дайсці...

Мы гартавалі сэрцы
І для бітваў,
Хоць потым лёс
Саміх нас пакараў,
Бо не заўсёды
Нашую малітву
Наш «родны бацька»
Шчыра паўтараў...

Свая бяда
Для ўсіх перасцярогай



Нам стаць змагла,
Каб не хлусіць нідзе.
І нам заўсёды
Той ісці дарогай,
Якой Радзіма
Да жыцця вядзе.

Любіць яе,
Служыць ёй да скanання,
Ісці прасторай
Родных ніў і рэк
І верным быць, як першаму каханню,
Што ў сэрцы след пакінула навек.





**ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА**

Даўно агеньчык той пагас,
Што з бацькам нам свяціў над полем.
Нас разлучыў трагічны час,
Працяўшы сэрцы цяжкім болем.

Казалі — бацька ўсім назло
Вёў з «кулакамі» ў вёсцы змовы...
І як мне горасна было
Чуць пра яго такія словы.

Казалі — ставілі яго
К сцяне, палоннага салдата...
І я, не знаючы ўсяго,
Не называў яго больш татам.

Я кветак не насіў яму,—
Не знаю, дзе ён пахаваны,
За што яго вялі ў турму,
Дзе ніці чорныя сатканы...

Шмат год пад нейкім каўпаком
І нада мной згушчаўся морак.
Я ў бой хадзіў палітруком,
А бацька мой — «народа вораг»...

Ды гэта ўсё было маной.
Цяпер вядома мне дакладна,
Што ён не лютаю вайной —
Рукой быў знішчаны ўсеўладнай —

Той, што ў вайну і без вайны
Нявінных тысячы знішчала
І без ніякае віны
Тады на многіх цень кідала.

Не замяла зіма сляды,
Дзе шмат напісана імёнаў.
Мне б адшукаць хоць праз гады
Адно імя сярод мільёнаў.

І я, абветраны вясной,
Да кургана іду ляснога,
Дзе пад высокаю сасной
Ляжаць салдаты. Як іх многа!

П'ючы вясеннюю расу,
Ўздыхае родная зямліца.
І кветкі бацьку я нясу,
Каб за нявіннасць пакланіцца.

Няхай нам родны край бацькоў
Шырэй свае расчыніць далі,
І каб да Бесядскіх віроў
Буслы здалёку прыляталі,

Каб тое, што было калісь,
Не паўтарылася ніколі.
Прабіўся на галінцы ліст
Як парастак шчаслівай долі.



Не раз нас білі перуны.
А ці маглі мы знаць, адкуль там
Яны былі пасланы культам
З сваёй жа роднай стараны?

Каб праз нягоды ўсе прайсці,
Хапіла духу нам і моцы.
Мы на палях і ў ратнай бойцы
Свой гонар сцвердзілі ў жыцці.

Даволі жыць нам нематой.
Адчуўшы новую пару, я
Вяртаюся на бераг той,
Дзе Бесядзь родная віруе.

1986—1988 гг.

## ЗМЕСТ

### СПОВЕДЗЬ САЛДАТА

*** *Павольна наша круціцца Зямля...* . . . . 7
Дзень Перамогі . . . . . . . . . . . . 8
Два лісты . . . . . . . . . . . . 10
Балада святла . . . . . . . . . . . . 12
Вяртанне з вайны . . . . . . . . . . . 14
Салаўі на плошчы . . . . . . . . . . . 15
Зямля Бацькі Міная . . . . . . . . . . 16
Твар вайны . . . . . . . . . . . . 18
Салдацкія сны . . . . . . . . . . . 20
Песня застаецца людзям . . . . . . . . 22
Воблік друга . . . . . . . . . . . . 23
Мая эстафета . . . . . . . . . . . . 26
Балада вернасці . . . . . . . . . . . 28
Зорнае слова . . . . . . . . . . . . 31
Апошні бой . . . . . . . . . . . . 32
Ля Брандэнбургскіх варот . . . . . . . . 34
Стралкоўка . . . . . . . . . . . . 38
Плач сойкі . . . . . . . . . . . . 40
Прысвячэнне . . . . . . . . . . . . 42
Шчырасць любові . . . . . . . . . . . 44
Агеньчык у акне . . . . . . . . . . . 46

### КАРЭННЕ ТРАВЫ

Галінка бэзу . . . . . . . . . . . . 51
Васількоавае поле . . . . . . . . . . . 54
Твой чэрвень . . . . . . . . . . . . 56



З Чарнобыльскай зоны
Прыпяцкія незабудкі . . . . . . . . . . 58
Брагінскі клён . . . . . . . . . . . 59
Сляды трывогі . . . . . . . . . . . 60
Карэнне травы . . . . . . . . . . . . 62
Вісленская былінка . . . . . . . . . . 64
На возеры Рыца . . . . . . . . . . . 66
Сляза сумлення (Паэма) . . . . . . . . 67
Сустрэча з вавёркай . . . . . . . . . . 74
*** Я жыў пад крыламі завей... . . . . . 76
Дзявочая песня . . . . . . . . . . . 77
Адзінота на вышыні . . . . . . . . . . 78
Святло незабудкі . . . . . . . . . . . 80

### ЗОЛАК НАД БЕСЯДДЗЮ

Зямля радзімічаў . . . . . . . . . . 85
Бесядскія віры (Паэма) . . . . . . . . 92

**Прыходзька П.**

П 85 Водгулле грому: Вершы і паэмы.— Мн.: Маст. літ., 1989.—158 с., [1] л. партр.: іл:

ISBN 5-340-00384-1.

Приходько П. Отзвук грома: Стихи и поэмы.

У новай кнізе паэзіі аўтар зноў вяртаецца на пройдзеныя франтавыя дарогі, піша пра тое, якой нялёгкай цаной дасталася нам перамога.

Многія вершы прасякнуты пачуццём шчырасці, сардэчнасці кахання, дружбы, любові да роднага краю, яго прыроды. У аснову паэмы «Бесядскія віры» пакладзены канкрэтныя падзеі з жыцця старэйшага і маладзейшага пакаленняў на зары заваёў Кастрычніка, станаўлення Савецкай улады.

П $\frac{4702120202-007}{М\ 302(03)-89}$ 63—89 ББК 84Бел7

*Литературно-художественное издание*

**Приходько Петр Федорович**

**ОТЗВУК ГРОМА**

*Стихи и поэмы*

Минск,
издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Прыходзька Пятро Фёдаравіч**

**ВОДГУЛЛЕ ГРОМУ**

*Вершы і паэмы*

Рэдактар Р. М. Яўсееў
Мастак І. І. Бокій
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава
Тэхнічны рэдактар Г. Г. Федарук
Карэктар Л. М. Маслоўская

ІБ № 3187

Здадзена ў набор 24.06.88. Падп. да друку 08.11.88. АТ 09723. Фармат $70\times90^1/_{32}$. Папера афс. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,85+0,07 укл. Ум. фарб. адб. 6,18. Ул.-выд. арк. 5,32. Тыраж 4200 экз. Зак. 1593. Цана 75 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.